МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Беларускі нацыянальны
тэхнічны ўніверсітэт

Кафедра «Гісторыя, сусветная і айчынная культура»

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

## Праграма дысцыпліны
## і планы семінарскіх заняткаў

Мінск
БНТУ
2014

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Кафедра «Гісторыя, сусветная і айчынная культура»

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

Праграма дысцыпліны
і планы семінарскіх заняткаў
для студэнтаў усіх спецыяльнасцей

Мінск
БНТУ
2014

УДК 94(476)(075.8)
ББК 63 3(4Беи)я7
Г 51

Складальнікі:
*У. А. Бажанаў*, *А. В. Бяляеў*, *А. В. Лепеш*, *А. Дз. Якубінская*

*Пад рэдакцыяй А. В. Бяляева, А. В. Лепеш*

Рэцэнзенты:
*Я. А. Грэбень*, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры філасофіі і гісторыі УА «БДАТУ»;
*А. К. Дубовік*, кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры «Паліталогія, сацыялогія і сацыяльнае кіраванне» БНТУ

Выданне падрыхтавана на аснове тыпавой вучэбнай праграмы для вышэйшых навучальных устаноў «Гісторыя Беларусі», зацверджанай Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь 15 красавіка 2008 г. (рэгістрацыйны нумар па дысцыпліне ТД-СГ.009/тып.), эксперыментальнай вучэбнай праграмы інтэграванага модуля для ўстаноў вышэйшай адукацыі на 2013–2014 навучальны год, зацверджанай Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь 12.06.2012 г. (рэгістрацыйны нумар па дысцыпліне ТД-СГ.04/эксп.), а таксама на аснове вучэбнай праграмы БНТУ «Гісторыя Беларусі» ў адпаведнасці з вучэбнымі планамі БНТУ.

© Беларускі нацыянальны
тэхнічны ўніверсітэт, 2014

## Ад аўтараў

Выданне па дысцыпліне «Гісторыя Беларусі» прадстаўляе сабой адзіны комплекс форм і метадаў для самастойнай працы студэнтаў. Яно ўключае ў сабе пералік вучэбных тэм, іх канкрэтны змест, тэмы і планы семінарскіх заняткаў, а таксама прыведзены асноўныя паняцці і тэрміны, якія студэнты павінны ведаць, імёны знакамітых гістарычных асоб розных часоў, храналогія гістарычных падзей, на якіх студэнты павінны сканцэнтраваць сваю ўвагу пад час самастойнай падрыхтоўкі да заняткаў і іспыту.

Планы семінарскіх заняткаў таксама змяшчаюць пытанні праблемнага тыпу, спісы тэм рэфератаў, якія павінны быць падрыхтаваны студэнтамі пад кіраўніцтвам выкладчыка. У час падрыхтоўкі да заняткаў або іспыту і пры напісанні рэфератаў студэнтам трэба выкарыстоўваць прыведзеную ў дапаможніку асноўную і дадатковую літаратуру. У канцы дапаможніка змешчаны правілы напісання і афармлення рэфератаў.

Вучэбна-метадычны дапаможнік мае свёй мэтай павысіць эфектыўнасць і якасць навучальнага працэсу і аказаць дапамогу студэнтам у вывучэнні гісторыі Беларусі.

## Модуль 1. ЦЫВІЛІЗАЦЫЙНАЯ СПАДЧЫНА СТАРАЖЫТНАГА СВЕТУ, СЯРЭДНІХ ВЯКОЎ І БЕЛАРУСЬ (100 тыс. гадоў таму – першая палова XVI ст.)

## УВОДЗІНЫ

Прадмет і задачы гістарычнай навукі. Паняцце гістарычнай навукі, яе роля ў сістэме гуманітарных ведаў. Тэарэтыка-метадалагічныя асновы і прынцыпы вывучэння гісторыі. Гісторыя Беларусі – састаўная частка еўрапейскай і сусветнай гісторыі. Фармацыйны і цывілізацыйны падыходы да вывучэння гісторыі.

Перыядызацыя айчыннай гісторыі. Старажытнасць, Сярэднявечча, Новы час, Найноўшы час.

Крыніцы па гісторыі Беларусі. Археалагічныя, этнаграфічныя, лінгвістычныя, вусныя, пісьмовыя, кінафотафонадакументы.

Айчынная гістарыяграфія. Развіццё гістарыяграфіі гісторыі Беларусі ў XIX–пачатку XX ст. : працы І. Грыгаровіча, І. Насовіча, Т. Нарбута, А. Кіркора, М. Федароўскага, Е. Раманава, М. Доўнар-Запольскага, В. Ластоўскага, Я. Карскага. Развіццё беларускай гістарыяграфіі ў міжваенны і пасляваенны перыяды. Сучасны стан навуковай распрацоўкі гісторыі Беларусі.

### *План семінара № 1*

### МЕТАДЫЧНЫ СЕМІНАР. УВОДЗІНЫ

#### План

1. Прадмет, задачы, функцыі гістарычнай навукі, яе месца ў сістэме гуманітарных ведаў.
2. Гісторыя Беларусі як састаўная частка ўсходнеславянскай і агульнаеўрапейскай гісторыі. Асноўныя падыходы да вывучэння гісторыі. Перыядызацыя айчыннай гісторыі.
3. Галоўныя крыніцы гісторыі Беларусі.
4. Развіццё айчыннай гістарыяграфіі. Сучасны стан навуковай распрацоўкі гісторыі Беларусі.

## Тэмы рэфератаў

1. Летапісы як гістарычныя крыніцы.
2. Я. Карскі і яго праца «Беларусы».
3. Знакамітыя гісторыкі Беларусі: В. Ластоўскі, У. Ігнатоўскі, М. Доўнар-Запольскі, У. Пічэта і інш.
4. Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны (археалогія, этнаграфія, нумізматыка, геральдыка, сфрагістыка).

## Літаратура


Беларусы: гіст.-этнагр. даслед.: у 8 т. / рэдкал.: В.К. Бандарчык (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Бел. навука, 1998–2005. – Т. 3: Гісторыя этналагічнага вывучэння / В.К. Бандарчык [і інш.]. – 1999.

Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь: матэрыялы круглага стала ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. – 2006. – № 10. – С. 3–18; № 11. – С. 3–18; № 12. – С. 3–22; 2007. – № 1. – С. 3–23.

Грыцкевіч, В. Крыніцы гістарычныя / В. Грыцкевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 1993–2003. – Т. 4. – С. 277–278.

Каханоўскі, Алесь. Гісторыя / Алесь Каханоўскі // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 1993–2003. – Т. 3. – С. 32–37.

Ліндснэр, Р. Гісторыя і ўлада: нацыянальны працэс і гістарычная палітыка ў Беларусі XIX–XX ст. / Р. Ліндснэр. – СПб.: Неўскі прасцяг, 2005.

Методологические проблемы истории: учебное пособие / под общей ред. В.Н. Сидорцова. – Минск: ТетраСистемс, 2006.

Слука, А.Г. Нацыянальная ідэя: шлях народа: генезіс праблемы / А.Г. Слука. – Мінск: РІВШ, 2005.

Тойнби, А.Дж. Постижение истории: избранное / А.Дж. Тойнби. – М.: Айрис пресс, 2006.

Гістарыяграфія гісторыі Беларусі / Г. Штыхаў [і інш.] // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 1993–2003. – Т. 3. – 1996. – С. 16–31.

Ясперс, К. Смысл и назначение истории / К. Ясперс. – М.: Республика, 1994.

## Тэма 1. БЕЛАРУСЬ У СТАРАЖЫТНЫ ПЕРЫЯД

**(2 гадзіны)**

Першабытнае грамадства – агульны этап у гісторыі чалавецтва. Асноўныя рысы першабытнага ладу. Сучасныя навуковыя погляды на прычыны, час і месца з’яўлення першага чалавека.

Даіндаеўрапейскі перыяд этнічнай гісторыі Беларусі. Першапачатковае засяленне тэрыторыі Беларусі. Асаблівасці матэрыяльнай культуры насельніцтва Беларусі на асноўных этапах каменнага веку (палеаліт, мезаліт, неаліт). Спажывецкая і вытворчая гаспадаркі. Неалітычная рэвалюцыя. Эвалюцыя сацыяльных адносін. Старажытныя фіна-угры.

Індаеўрапейскі перыяд этнічнай гісторыі Беларусі. «Вялікае перасяленне народаў». Канцэпцыі паходжання і міграцыі індаеўрапейцаў. Балты, славяне, германцы.

Балцкі этап індаеўрапейскага перыяду. Прарадзіма балтаў і іх рассяленне на тэрыторыі Беларусі. Гаспадарка, сацыяльныя адносіны і грамадскі лад плямён жалезнага веку на Беларусі.

Славянскі этап індаеўрапейскага перыяду. Асноўныя канцэпцыі вызначэння славянскай прарадзімы. Прычыны і шляхі славянскай міграцыі. Пачатак рассялення славян на тэрыторыі Беларусі і славянізацыя балтаў.

Духоўная культура насельніцтва Беларусі. Славянскае язычніцтва: першабытныя формы рэлігіі і міфалогія. Рацыянальныя веды. Першабытныя формы мастацтва.

## Тэма 2. БЕЛАРУСЬ У РАННІМ СЯРЭДНЯВЕЧЧЫ. СТАНАЎЛЕННЕ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ ЎСХОДНІХ СЛАВЯН. ПЕРШЫЯ ДЗЯРЖАЎНЫЯ ЎТВАРЭННІ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (VIII–першая палова XIII ст.)

**(2 гадзіны)**

Эпоха Сярэднявечча ў Еўропе: асноўныя тэндэнцыі палітычнага, эканамічнага, рэлігійнага, культурнага развіцця. Складванне феадальных адносін. Фарміраванне раннекласавага грамадства. Зараджэнне дзяржаўнасці ў варварскіх народаў Еўропы.

Этнічныя славянскія супольнасці на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Крывічы, дрыгавічы, радзімічы: паходжанне назваў, тэрыторыі рассялення. Асаблівасці іх грамадскага ладу, асноўныя заняткі і вераванні.

Станаўленне раннефеадальных дзяржаўных утварэнняў усходніх славян. Асноўныя канцэпцыі заснавання старажытнарускай дзяржавы. Шлях «з варагаў у грэкі». Паняцце «Кіеўская Русь». Феадальная раздробленасць.

Полацкае і Тураўскае княствы – першыя дзяржаўныя ўтварэнні на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Палітычная гісторыя Полацкага княства, яго ўзаемаадносіны з Кіевам і Ноўгарадам. Барацьба супраць крыжакоў і мангола-татар. Дзяржаўны і грамадскі лад у землях-княствах. Развіццё сельскай гаспадаркі, рамёстваў і гандлю на землях Беларусі ва ўмовах станаўлення феадалізму.

Культура беларускіх зямель у IX–XIII стст. Прыняцце хрысціянства і яго ўплыў на развіццё пісьменнасці і літаратуры. Помнікі пісьменнасці, традыцыі летапісання. Культурна-асветніцкая дзейнасць Е. Полацкай, К. Тураўскага, К. Смаляціча. Дойлідства, выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.

***План семінара № 2***

## БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў СТАРАЖЫТНЫ ПЕРЫЯД. СТАНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ ФЕАДАЛЬНЫХ АДНОСІН НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ (IX–першая палова XIII ст.)

**(2 гадзіны)**

### План

1. Даіндаеўрапейскі перыяд этнічнай гісторыі Беларусі: каменны век.
2. Індаеўрапейскі перыяд этнічнай гісторыі Беларусі: бронзавы і жалезны вякі. Балты і славяне на тэрыторыі Беларусі.
3. Зараджэнне дзяржаўнасці ва ўсходніх славян. Кіеўская Русь. Полацкае і Тураўскае княствы – першыя раннефеадальныя дзяржаўныя ўтварэнні на тэрыторыі Беларусі.
4. Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё беларускіх зямель у IX–III стст.
5. Прыняцце і распаўсюджанне хрысціянства. Культура беларускіх зямель у IX–XIII стст.

## *Старажытны перыяд*

***Асноўныя паняцці***: палеаліт, мезаліт, неаліт, археалагічная культура, праабшчына, родавая абшчына, племя, неалітычная рэвалюцыя, спажывецкая гаспадарка, паляванне, збіральніцтва, вытворчая гаспадарка, земляробства, жывёлагадоўля, ганчарства, ткацтва, прадзенне, фіна-угры, бронзавы век, жалезны век, кавальства, этнагенез, індаеўрапейцы, балты, славяне, германцы, крывічы, дрыгавічы, радзімічы, лядна-агнявое земляробства, гарадзішча, вялікае перасяленне народаў, язычніцтва, політэізм, анімізм, фетышызм, татэмізм, магія, капішча.

## *Археалагічная перыядызацыя*

1. Каменны век – ад 100–40 да 2-га тыс. да н. э., падзяляецца на перыяды:

1) палеаліт (ранні каменны век) – ад 100–40 да 10 тыс. да н. э.;

2) мезаліт (сярэдні каменны век) – 9–5 тыс. да н. э.;

3) неаліт  (новы каменны век) – 4–3 тыс. да н. э.;

2. Бронзавы век – II – пачатак I тыс. да н. э.;

3. Жалезны век – VIII–VII ст. да н. э.–VIII ст. н. э.

## *Этнічная перыядызацыя*

1. Даіндаеўрапейскі перыяд (100–40–мяжа 3–2 тыс. да н. э.).

2. Індаеўрапейскі перыяд (2-е тыс. да н. э.–сучаснасць), падзяляецца на этапы:

1) Балцкі этап (2-е тыс. да н. э.–VI–VII стст. н. э. на поўдзень ад ракі Прыпяць; 2-е тыс. да н. э.–VIII ст. н. э. на поўнач ад ракі Прыпяць);

2) Славянскі этап (VI–VII ст. н. э.–сучаснасць).

## *Перыяд станаўлення дзяржаўнасці*

***Кіеўскія князі:*** Рурык (862–879), Алег (879–912), Ігар (912–945), Вольга (945–957), Святаслаў (957–972), Яраполк (972–980), Уладзімір Чырвонае Сонейка (980–1015), Святаполк Акаянны (1015–1019), Яраслаў Мудры (1019–1054), Уладзімір Манамах (1113–1125).

***Полацкія князі:*** Рагвалод (?–980), Рагнеда, Ізяслаў (988–1001), Брачыслаў (1003–1044), Усяслаў Чарадзей (1044–1101), Глеб Мінскі, Барыс Полацкі, Святаслаў Віцебскі, Давыд Лагойскі, Уладзімір (1186–1216).

***Асноўныя паняцці:*** дзяржаўнасць, Кіеўская Русь, Куявія, Славія, варагі, хазары, феадалізм, феадальная раздробленасць, удзельныя княствы, міжусобныя войны, мангола-татары, шлях «з варагаў у грэкі», валокі, суседская (тэрытарыяльная) абшчына, дзядзінец, князь, баяры, дружына, вотчына, халопы, закупы, радовічы, удачы, ізгоі, смерды, верв, палюддзе, веча, рада, пасаднік, тысяцкі, цівун, ключнік, падвойскі, епіскап, воласць, «Руская праўда».

### ***Храналогія падзей***

862 г. – Полацк упершыню ўзгадваецца ў пісьмовых крыніцах.
980 г. – захоп Полацка Уладзімірам.
1019 г. – бітва на рацэ Альта.
1021 г. – бітва на рацэ Судамір.
1065 г. – аблога Пскова Усяславам.
1066 г. – штурм Ноўгарада Усяславам.
3 сакавіка 1067 г. – бітва на рацэ Няміга.
1116 г. – паход Глеба Мінскага на Слуцк.
1117 г. – паход Глеба Мінскага на Оршу і Копысь.
1119 г. – Уладзімір Манамах бярэ Глеба Мінскага ў палон.
1127 г. – падпарадкаванне Мсціславам Полацкага княства Кіеўскаму.
1129 г. – сорак удзельных полацкіх князёў высланы ў Візантыю.
1132 г. – полацкае веча выгнала пасадніка кіеўскага князя Ізяслава і выбрала прадстаўніка полацкай дынастыі Васільку Святаславіча.
1184 г. – каталіцкі манах Мейнард атрымаў дазвол ад Уладзіміра Полацкага на місіянерскую дзейнасць у вусці Заходняй Дзвіны.
1201 г. – заснаванне крэпасці Рыга.
1202 г. – заснаванне ордэна Мечаносцаў.
1203 г. – асада Уладзімірам Полацкім крэпасці крыжакоў Ікскуль.
1206 г. – асада Уладзімірам Полацкім крэпасці крыжакоў Гольм.
1208 г. – захоп крыжакамі Кукенойса.

1209 г. – захоп крыжакамі Герцыке.

1216 г. – падрыхтоўка сумеснага паходу палачан, смалян, ліваў, эстаў супраць крыжакоў.

1210 і 1223 гг. – дамовы Полацка з Рыгай аб свабодным гандлі па Дзвіне ад Полацка да Рыгі.

1223 г. – бітва на рацэ Калка.

1230 г. – заснаваны Тэўтонскі ордэн.

1238 г. – Бату-хан падпарадкаваў Уладзіміра-Суздальскае і Смаленскае княствы.

1239–1241 гг. – мангола-татары спалілі Гомель, Тураў, Мазыр, Пінск, Бярэсце.

1240 г. – бітва на рацэ Нява.

1242 г. – бітва на Чудскім возеры.

1242 і 1249 гг. – няўдалыя спробы мангола-татар прарвацца ў цэнтральныя землі Беларусі.

### *Культура беларускіх зямель у IX–XIII стст.*

***Асноўныя паняцці:*** хрысціянізацыя, двухвер'е, царква, епархія, манастыр, «стоўпніцтва», скрыпторый, кірыліца, «Рагвалодавы (Барысавы) камяні», берасцяныя граматы, летапісанне, агіяграфія, пергамент, пісалы, «Аповесць мінулых гадоў», «Слова пра паход Ігаравы», мураванае дойлідства, архітэктурная школа, неф, апсіда, плінфа, мазаіка, іканапіс, крыжова-купальны храм.

### *Храналогія падзей*

988 г. – афіцыйная дата хрышчэння Русі.

992 г. – заснаванне Полацкай епархіі.

1005 г. – заснаванне Тураўскай епархіі.

1054 г. – раскол хрысціянскай царквы на каталіцкую і праваслаўную.

1044–1066 гг. (1050–1055 гг.) – будаўніцтва Сафійскага сабора.

XI ст. – Тураўскае евангелле.

XII ст. – Друцкае евангелле.

XII ст. – Барысавы камяні.

1161 г. – па замове Еўфрасінні Полацкай майстар-ювелір Лазар Богша зрабіў напрастольны крыж.

### *Дзеячы культуры*

Міна – першы вядомы епіскап Полацкай епархіі; Еўфрасіння Полацкая (?–1173) – асветніца, заснавальніца царквы Спаса і жаночага манастыра ў Полацку; Іаан (XII ст.) – дойлід, які пабудаваў Спаскую царкву ў Полацку; Кірыла, епіскап Тураўскі (1130?–1182) – пачынальнік рэлігійнай літаратуры ва Усходняй Еўропе, аўтар словаў, прытчаў, рэлігійных вершаў і малітваў; Клімент Смаляціч (XII ст.) – кіеўскі мітрапаліт, аўтар першага вядомага ў Беларусі пісьмовага твора «Пасланне прасвітару Фаме».

### *Помнікі архітэктуры*

Полацкі сабор Святой Сафіі (XI ст.), Спаская царква ў Полацку (XII ст.), Пятніцкая і Барысаглебская цэрквы ў Бельчыцах (XII ст.), Дабравешчанская царква ў Віцебску (XII ст.), Барысаглебская (Каложская) царква ў Гародні, «Белая» вежа-данжон валынскага тыпу ў Камянцы (XIII ст.).

## Пытанні для абмеркавання і разважання

*1. Запоўніце табліцу «Археалагічныя культуры старажытнай эпохі».*

| Перыяд | Назва культуры, арэал | Характэрныя расы | Этнічная прыналежнасць |
|---|---|---|---|
| | | | |

*2. Вызначце характэрныя рысы культуры індаеўрапейцаў.*

*3. Ахарактарызуйце асноўныя канцэпцыі паходжання балтаў, славян.*

*4. Вызначце асаблівасці ўсходнеславянскага язычніцтва .*

*5. Пералічыце асноўныя прычыны ўзнікнення дзяржаўнасці ва ўсходніх славян.*

*6. Ахарактарызуйце нарманскую і антынарманскую канцэпцыі ўзнікнення дзяржаўнасці ў Старажытнай Русі.*

*7. Ахарактарызуйце ўзаемаадносіны Полацкага княства з Кіеўскім і Наўгародскім у IX–XII стст.*

*8. Назавіце асноўныя прычыны феадальнай раздробленасці.*

*9. Пералічыце асноўныя падзеі, звязаныя з барацьбой Полацкага княства з крыжакамі.*

*10. Вызначце ролю хрысціянства ў развіцці культуры беларускіх зямель.*

## Тэмы рэфератаў

1. Тапаніміка Беларусі як гістарычная крыніца.
2. Асноўныя канцэпцыі паходжання індаеўрапейцаў.
3. Язычніцтва ўсходніх славян і яго асаблівасці на беларускіх землях.
4. Роля варагаў у фарміраванні старажытнарускай дзяржаўнасці.
5. Шлях «з вараг у грэкі» ў сацыяльна-эканамічным развіцці беларускіх зямель у перыяд высокага сярэднявечча.
6. Барацьба Полацкага княства з крыжакамі ў канцы XII–першай палове XIII ст.
7. Культурна-асветніцкая дзейнасць Еўфрасінні Полацкай і Кірылы Тураўскага.

## Літаратура

Арлоў, У.А. Таямніцы полацкай гісторыі / У.А. Арлоў. – Мінск: Полымя, 2000.

Археалогія Беларусі: у 4 т. / пад рэд. М.М. Чарняўскага, А.Г. Калечыц. – Мінск: Беларуская навука, 1997. – Т. 1: Каменны і бронзавы вякі.

Археалогія Беларусі: у 4 т. / навук. рэд. В. І. Шадыра, В. С. Вяргей. – Мінск: Беларуская навука, 1999. – Т. 2: Жалезны век і ранняе сярэднявечча.

Беларусы: гіст.-этнагр. дослед. / НАН Беларусі; рэдкал. : В.К. Бандарчык [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка; Бел. навука, 1995–2009. – Т. 9: Антрапалогія / Л. І. Цягака [і інш.]. – 2006. – 575 с.

Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва, 2000–2008. – Т. 1: Старажытная Беларусь: Ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. – 2000.

Дзярновіч, С. Сувязі Полацка са Скандынавіяй у эпоху вікінгаў / С. Дзярновіч // Беларускі гістарычны часопіс. – 2004. – № 5. – С. 38.

Дук, Дз. Старажытныя славяне Полацкага гарадзішча / Дз. Дук // Беларускі гістарычны часопіс. – 2008. – № 7. – С. 21.

Егарэйчанка, А. Асноўныя заняткі пляменаў Браслаўскага Паазер’я І тыс. да н. э. / А. Егарэйчанка // Беларускі гістарычны часопіс. – 2006. – № 8. – С. 39.

Ермаловіч, М.І. Старажытная Беларусь. Полацкі і Новагародскі перыяд / М.І. Ермаловіч. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1990.

Загарульскі, Э.М. Заходняя Русь: IX–XIII стст. / Э.М. Загарульскі. – Мінск: Універсітэцкае, 1998.

Калечыц, А.Г. Першыя людзі на зямлі Беларусі: вучэбны дапаможнік / А.Г. Калечыц. – Мінск: Бел. навука, 2007.

Лысенко, П.Ф. Туровская земля IX–XIII вв. / П.Ф. Лысенко. – Минск: Бел. навука, 1999.

Піліпенка, М.Ф. Фарміраванне Русі / М.Ф. Піліпенка // Беларусь на мяжы тысячагоддзяў: сб. – Мінск: БелЭн, 2000. – С. 30–43.

Повесть временных лет / пер. Д. С. Лихачёва. – Петрозаводск : Карелия, 1991.

Радзюль, Я. Язычніцтва. Народны каляндар і святкаванні (матэрыял для паглыбленага вывучэння гісторыі) / Я. Радзюль // Беларускі гістарычны часопіс. – 2005. – № 11. – С. 73.

Рыбаков, Б.А. Язычество Древней Руси / Б.А. Рыбаков. – М., 2003.

Рыбаков, Б.А. Язычество древних славян / Б.А. Рыбаков. – Изд. 2-е. – М.: София; Гелиос, 2002.

Саверчанка, І. В. «Полацкі летапіс» – галоўная крыніца палітычнай гісторыі Беларусі XII ст. / І. В. Саверчанка // Беларускі гістарычны часопіс. – 2010. – № 5. – С. 13–18.

Штыхаў, Г.В. Старажытныя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі / Г. В. Штыхаў. – 2-е выд., выпр. – Мінск : Права і эканоміка, 2002.

## Тэма 3. БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў СКЛАДЗЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА, РУСКАГА І ЖАМОЙЦКАГА (СЯРЭДЗІНА XIII–ПЕРШАЯ ПАЛОВА XVI ст.)

**(2 гадзіны)**

Асноўныя тэндэнцыі ў палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным развіцці Заходняй і Усходняй Еўропы ў познім Сярэднявеччы. Імкненне да кансалідацыі грамадства ў Англіі, Францыі, Польшчы. Утварэнне цэнтралізаваных дзяржаў. Фарміраванне і ўзвышэнне Маскоўскай дзяржавы.

Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя передумовы фарміравання ВКЛ. Роля ўсходнеславянскіх зямель у працэсе дзяржаўнага будаўніцтва ў ВКЛ. Федэратыўны прынцып пабудовы ВКЛ і цэнтралізатарская палітыка вялікіх князёў літоўскіх. Пашырэнне тэрытарыяльных межаў. Крэўская унія (1385 г.) і яе наступствы. Грунвальдская бітва (1410 г.) і яе значэнне. Асноўныя накірункі знешняй палітыкі ВКЛ, барацьба за гегемонію ва Усходняй Еўропе ў XIV–XVI стст.

Дзяржаўны і грамадскі лад Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. Эвалюцыя ВКЛ ад адзінаўладдзя да саслоўна-прадстаўнічай манархіі. Цэнтральныя і мясцовыя органы ўлады і кіравання ў ВКЛ, іх функцыі. Судовая сістэма. Крыніцы права.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у складзе ВКЛ. Феадальнае землекарыстанне і сельская гаспадарка. Фарміраванне саслоўяў феадальнага грамадства. Асноўныя этапы запрыгоньвання сялян. Аграрная рэформа Жыгімонта ІІ Аўгуста (валочная памера). Гарады Беларусі – цэнтры рамёстваў і гандлю. Магдэбургскае права і сістэма гарадскога самакіравання.

Асаблівасці культурнага развіцця беларускіх зямель у складзе ВКЛ. Станаўленне старабеларускай мовы і яе статус у ВКЛ. Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці беларускага этнасу. Этнічныя працэсы на беларускіх землях. Вытокі беларускага этнасу. Тэорыі паходжання беларусаў. Паходжанне і ўсталяванне назвы «Белая Русь». Фарміраванне беларускага этнасу.

Новая эпоха ў культурным развіцці Еўропы. Гуманізм. Распаўсюджванне ідэй Рэнесансу. Адраджэнне на Беларусі. Францыск Скарына – першадрукар, асветнік і гуманіст.

Літаратура. Светапогляд і гуманістычная дзейнасць Міколы Гусоўскага, Сымона Буднага, Васіля Цяпінскага.

Дойлідства і мастацтва Беларусі ў складзе ВКЛ (выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, тэатр і музыка).

Роля і месца беларускай культуры Сярэднявечча ў агульнаеўрапейскім культурна-цывілізацыйным працэсе.

***План семінара № 3***

## БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў СКЛАДЗЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА, РУСКАГА І ЖАМОЙЦКАГА: ПАЛІТЫЧНАЕ, САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ І КУЛЬТУРНАЕ РАЗВІЦЦЁ (сярэдзіна ХІІІ–першая палова XVI ст.)

**(2 гадзіны)**

### План

1. Утварэнне Вялікага Княства Літоўскага: асноўныя падыходы і канцэпцыі. Роля беларускіх зямель у станаўленні балта-славянскай дзяржавы.
2. Дзяржаўны і грамадскі лад Вялікага Княства Літоўскага. Статуты ВКЛ.
3. Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у складзе Вялікага Княства Літоўскага ў другой палове XIII–першай палове XVI стст. Аграрная рэформа Жыгімонта II Аўгуста (валочная памера).
4. Грамадска-палітычнае развіццё Вялікага Княства Літоўскага ў XIV–першай палове XVI ст. Крэўская унія і яе вынікі.
5. Асноўныя напрамкі знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага ў другой палове XIII–першай палове XVI ст.
6. Культура беларускіх зямель у складзе ВКЛ.

### Гаспадары (князі) ВКЛ

Міндоўг (1235–1263); Трайнята (1263–1264); Войшалк (1263–1267); Шварн Данілавіч (1267–1270); Трайдэн (1270–1282); Віцень (1295–1316); Гедымін (1316–1341); Яўнуцій (Яўнут) (1341–1345);

Альгерд (1345–1377); Ягайла (з 1385 г. – Уладзіслаў) Альгердавіч (1377–1392); Вітаўт Кейстутавіч (1392–1430); Свідрыгайла Альгердавіч (1430–1432); Сігізмунд (Жыгімонт) Кейстутавіч (1432–1440); Казімір Уладзіслававіч (Ягайлавіч) (1440–1492); Аляксандр Казіміравіч (1492–1506); Сігізмунд (Жыгімонт) I Стары (1506–1548); Сігізмунд (Жыгімонт) II Аўгуст (1548–1572).

### *Іншыя палітічныя дзеячы*

Аляксандр Неўскі, Якаў Палачанін, Давыд Гарадзенскі, Дзмітрый Данскі, Кейстут, Ядвіга, Ульрых фон Юнгінген, Рыгор Цамблак, Фёдар Бельскі, Іван Гальшанскі, Міхаіл Глінскі, Іван III, Іван IV.

### *Асноўныя паняцці, што тычацца дзяржаўнага і палітычнага ладу ВКЛ*

Гаспадар, рада (паны-рада), пярэдняя рада (лава), вальны сейм (сойм), павятовы сеймік, маршалак земскі, гетман, канцлер, падскарбій, ваявода, падваявода, кашталян, староста, харунжы, маршалак павятовы, ваяводства, павет, магдэбургскае права, магістрат, гарадская рада, гарадская лава, войт, бурмістр, радца, лаўнік, судзебнік Казіміра (1468), статуты ВКЛ (1529, 1566, 1588), прывілеі (Казіміра, 1447; Аляксандра, 1492), трыбунал ВКЛ, суды (гродскі, земскі, падкаморскі, копны, вотчынны), Крэўская унія (1385), Гарадзельская унія (1413).

***Асноўныя паняцці, што тычацца грамадскага і сацыяльна-эканамічнага ладу:*** станы (саслоў’і), феадалы (шляхта, магнаты, паны, баяры), сяляне (людзі пахожыя, людзі непахожыя, чэлядзь нявольная, закупы, слугі, цяглыя, асадныя (чыншавыя), даннікі, дольнікі, агароднікі, бабылі), мяшчане (рамеснікі, партачы, купцы, госці, прасолы, чорныя людзі), духавенства, павіннасці (паншчына, чынш, дзякла, даніна), прыгоннае права, цэхі, юрыдыкі, «Устава на валокі» (1557), фальварак, валока, дым, служба, саха.

***Асноўныя паняцці, тэрміны і назвы:*** крыжакі, ордэн Мечаносцаў, Лівонскі ордэн, Тэўтонскі ордэн, харугва, татара-манголы, ярлык, тумен, Залатая Арда, Галіцка-Валынскае княства, Маскоўскае княства, Навагрудак, Вільня, «Пагоня», «Кведлінбургскія аналы», Літва, аўкштайты, жэмайты, прусы, беларусцы, русіны, літвіны, Белая Русь, Чорная Русь, Чырвоная Русь, Польшча.

### *Асноўныя падзеі*

Сярэдзіна 1230-х гг. – утварэнне ВКЛ.
1251 г. – хрышчэнне Міндоўга ў каталіцтва.
1253 г. – каранацыя Міндоўга.
1260 г. – бітва на возеры Дурбе.
1307 г. – далучэнне Полацка да ВКЛ.
1323 г. – заснаванне Вільні.
1331 г. – бітва на рацэ Акмяне.
1348 г. – бітва на рацэ Стрэве.
1363 г. – бітва на рацэ Сінія Воды.
1368, 1370, 1372 гг. – паходы Альгерда на Маскву.
1380 г. – Кулікоўская бітва.
1382 г. – забойства Кейстута.
1385 г. – Крэўская унія.
1392 г. – Востраўскае пагадненне.
1399 г. – бітва на рацэ Ворскле.
1401 г. – Віленска-Радамская унія.
1409–1411 гг. – Вялікая (Пруская) вайна.
1410 г. – Грунвальдская бітва.
1413 г. – Гарадзельская унія.
1447 г. – прывілей Казіміра.
1468 г. – судзебнік Казіміра.
1481 г. – змова супраць Казіміра.
1492 г. – прывілей Аляксандра.
1500 г. – бітва на рацэ Вядрошы.
1506 г. – Клецкая бітва.
1508 г. – мяцеж Міхаіла Глінскага.
1492–1494, 1500–1503, 1507–1508, 1512–1522, 1534–1537 гг. – войны Маскоўскага княства з ВКЛ.
1514 г. – бітва на рацэ Крапіўне (бітва пад Оршай).
1529, 1566, 1588 гг. – прынящце статутаў ВКЛ.

1557 г. – прыняцце «Уставы на валокі» (валочная рэформа).
1558–1582 гг. – Лівонскя вайна.
1565–1566 гг. – адміністрацыйна-судовая рэформа.
1563 г. – заняцце Полацка рускім войскам.
1569 г. – Люблінская унія.

### *Культура Беларускіх зямель у час існавання ВКЛ (XIII–XVI стст.)*

***Асноўныя паняцці:*** рэнесанс, гуманізм, пратэстантызм, рэфармацыя, брацтвы;

архітэктурныя стылі (раманскі, гатычны, беларуская абарончая готыка, рэнесанс), Троіцкі касцёл (в. Ішкалдзь), Мураванкаўская, Сынкавіцкая і Супрасальская цэрквы, Кацярынінская (Петрапаўлаўская) царква ў Мінску, замкі (Крэўскі, Наваградскі, Лідскі, Мірскі, Гальшанскі і інш.), пратэстанцкія (кальвінскія) зборы;

беларускі іканапіс, сармацкі партрэт, фрэскі, драўляная скульптура;

батлейка;

друкарня, скрыпторый.

### *Дзеячы культуры*

Францыск Скарына (1490–1551), Мікола Гусоўскі (1470–1553), Сымон Будны (1530–1593), Васіль Цяпінскі (1530–1603), Іван Фёдараў, Пётр Мсціславец, Мікалай Радзівіл Чорны (1515–1565), Ян Вісліцкі, Андрэй Рымша, Ян Радван, браты Мамонічы.

### *Помнікі літаратуры*

Біблія (1517–1519), Песня пра зубра (1522), Малая падарожная кніжыца (1522), Апостал (1525), Катэхізіс (1562), Берасцейская біблія (1563), Евангелле (1570), Нясвіжская біблія (1572), Астрожская біблія (1580–1581); Летапісец Вялікіх князёў Літоўскіх (1396), Пахвала Вітаўту (1420-я гг.), Беларуска-літоўскі летапіс (1446), Баркулабаўскі летапіс, «Хроніка польская, літоўская, жамойцкая і ўсяе Русі» М. Стрыйкоўскага (1582).

## Пытанні для абмеркавання і разважання

*1. Назавіце палітычныя (унутраныя і знешнія) і эканамічныя прычыны ўзнікнення Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. Якую ролю адыгрывалі пры яго з'яўленні балцкі і славянскі этнасы, чаму? Якое азначэнне вам падаецца найбольш правільным і чаму: ВКЛ – гэта літоўская, славянская, руская, беларуская, балта-славянская, беларуска-літоўская дзяржава?*

*2. Ахарактарызуйце дзяржаўна-палітычны лад ВКЛ: ці была гэта манархія абсалютная, абмежаваная, саслоўна-прадстаўнічая? Абгрунтуйце свой адказ.*

*3. Назавіце вышэйшыя і мясцовыя органы ўлады ў ВКЛ, іх кампетэнцыю, параўнайце з органамі ўлады і кіравання часоў Кіеўскай Русі, Полацкага і Тураўскага княстваў. Якія істотныя змены ў сістэме кіравання, на ваш погляд, адбыліся за гэты час?*

*4. У чым сутнасць феадальнай эканамічнай сістэмы, што склалася на беларускіх землях у эпоху існавання ВКЛ? Вызначце асноўныя этапы запрыгоньвання сялян, параўнайце іх становішча ў ВКЛ з часамі Кіеўскай Русі.*

*5. Што такое феадальная лесвіца? Якія саслоўі (станы) склаліся ў ВКЛ і што вы ведаеце пра іх?*

*6. Назавіце асноўныя накірункі знешняй палітыкі ВКЛ у XIII–XVI стст. Хто быў галоўным ворагам дзяржавы ў розныя перыяды? Якія найбольш значныя ваенныя падзеі таго часу вы ведаеце?*

*7. Як, на ваш погляд, Крэўская унія адбілася на лёсе беларускага народа? Ці магло княства пайсці па іншаму шляху, адмовіўшыся ад саюзу з Польшчай? Якія былі магчымы альтэрнатыўныя гістарычныя шляхі?*

*8. Ці справядліва сцвярджэнне, што XVI стагоддзе – гэта залаты век беларускай культуры? Якія працэсы ў гэты час адбываюцца ў культурным развіцці Еўропы і як яны адлюстраваліся на беларускіх землях?*

## Тэмы рэфератаў

1. Вытокі беларускага этнасу. Канцэпцыі паходжання назвы «Белая Русь». Станаўленне старабеларускай мовы і развіццё літаратуры ў XIV–першай палове XVI ст.

2. Распаўсюджванне ідэй Адраджэння на тэрыторыі Беларусі. Дзейнасць Міколы Гусоўскага, Францыска Скарыны і яго паслядоўнікаў у час беларускага Рэнесансу.

3. Архітэктура, выяўленчае і тэатральна-музычнае мастацтва на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIII–першай палове XVI ст.

4. Беларускі феадальны горад.

5. Прававая і судовая сістэма ВКЛ, асноўныя помнікі прававой думкі.

6. Батлейка – беларускі народны лялечны тэатр.

## Літаратура

Асветнікі зямлі Беларускай. Х–пачатак XX ст.: энцыклапедычны даведнік / рэдкал. Г.П. Пашкоў (гал. Рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 2006.

Вішнеўскі, А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі / А.Ф. Вішнеўскі. – Мінск: ТетраСистемс, 2005.

Вялікае Княства Літоўскае: энцыклапедыя: у 2 т. / гал. рэд. Г.П. Пашкоў. – Мінск: БелЭн, 2005–2006. – Т. 1. – 2005; – Т. 2. – 2006.

Вялікае Княства Літоўскае. Культура і асвета / Т.В. Габрусь [і інш.] // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 1993–2003. – Т. 2. – 1994. – С. 406–412.

Гарэцкі, М. Гісторыя беларускае літаратуры / М. Гарэцкі. – Мінск: Маст. літ., 1992.

Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва, 2000–2008. – Т. 2: Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага. – 2007.

Гісторыя беларускага мастацтва: у 6 т. / рэдкал.: С.В. Марцэлеў [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1988.

Вялікае Княства Літоўскае / А.П. Грыцкевіч [і інш.] // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 1993–2003. – Т. 2. – 1994. – С. 387–423.

Дзмітрачкоў, П.Ф. Беларусь у складзе Вялікага Княства Літоўскага (другая палова XIII–першая палова XVII ст.): вучэбны дапаможнік / П.Ф. Дзмітрачкоў. – Магілёў: МДУ імя А.А. Куляшова, 2003.

Ермаловіч, М.І. Беларуская дзяржава Вялікае Княства Літоўскае / М.І. Ермаловіч. – Мінск: Беллітфонд, 2003.

Краўцэвіч, А.К. Стварэнне Вялікага Княства Літоўскага / А.К. Краўцэвіч. – Беласток: Вышэйшая школа публічнай адміністрацыі, 2008.

Насевіч, В.Л. Пачаткі Вялікага Княства Літоўскага: падзеі і асобы / В.Л. Насевіч. – Мінск: Полымя, 1993.

Рэлігія і царква на Беларусі: энцыклапедычны даведнік / рэдкал.: Г.П. Пашкоў [і інш.] – Мінск: БелЭн, 2001.

Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588 г.: тэксты, даведкі, каментарыі. – Мінск: Беларусь, 2002.

Трусаў, А.А. Манументальнае дойлідства Беларусі XI–XVIII стст.: гісторыя будаўнічай тэхнікі / А.А. Трусаў. – Мінск: Лекцыя, 2001.

Ф. Скарына і яго час: энцыкл. даведнік. – Мінск: БелСЭ, 1990.

Чаропка, В.К. Уладары Вялікага княства / В.К. Чаропка. – Мінск: Беларусь, 2002.

Юхо, Я.А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: у 2 ч. / Я.А. Юхо. – Ч.1. – Мінск: РІВШ, 2003.

## Модуль 2. ЦЫВІЛІЗАЦЫЙНЫЯ ПРАЦЭСЫ НОВАГА ЧАСУ І БЕЛАРУСЬ (ДРУГАЯ ПАЛОВА XVI–ПАЧАТАК XX ст.)

### Тэма 4. ПАЧАТАК НОВАГА ЧАСУ Ў АЙЧЫННАЙ ГІСТОРЫІ. БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў СКЛАДЗЕ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ (ДРУГАЯ ПАЛОВА XVI–XVIII ст.)

**(2 гадзіны)**

Новыя тэндэнцыі ў развіцці Еўропы. Эпоха вялікіх адкрыццяў і вынаходніцтваў. Паскарэнне эканамічнага развіцця. Зараджэнне капіталістычных адносін. Першыя буржуазныя рэвалюцыі ў Еўропе. Галоўныя рысы сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця заходнееўрапейскіх краін у другой палове XVI–XVIII ст.

Люблінская унія (1569 г.) і ўтварэнне Рэчы Паспалітай. Умовы аб’яднання ВКЛ і Польшчы.

ВКЛ у палітычнай сістэме Рэчы Паспалітай. Змены ва ўнутранай палітыцы вярхоўнай улады. Узмацненне польскага ўплыву ў палітычным і культурна-рэлігійным жыцці. Барацьба за самастойнасць ВКЛ. Распрацоўка і прыняцце Статута ВКЛ 1588 г.

Сацыяльна-эканамічнае становішча беларускіх зямель у складзе Рэчы Паспалітай. Стан сельскай гаспадаркі. Абвастрэнне сацыяльных супярэчнасцей. Эканамічнае развіццё гарадоў і мястэчак. Гарадскія рамёствы і гандаль. Цэхавыя арганізацыі. Зараджэнне мануфактурнай вытворчасці.

Ваенныя дзеянні на Беларусі ў 1648–1667 гг. і іх цяжкія наступствы для беларускіх зямель. Дэмаграфічны рэгрэс і эканамічны заняпад на Беларусі. Аслабленне каралеўскай улады. Узмацненне феадальнай анархіі. Сацыяльныя супярэчнасці.

Нармалізацыя эканамічнага жыцця на тэрыторыі Беларусі ў сярэдзіне XVIII ст. Аднаўленне сельскай і гарадской гаспадаркі. Пачатак разлажэння феадалізму. Эканамічныя рэформы 60–90-х гг. XVIII ст. у Рэчы Паспалітай.

Абвастрэнне палітычнага крызісу ў Рэчы Паспалітай у 1760–1770-я гг. Роля дысідэнцкага пытання. Умяшанне суседніх дзяржаў.

Першы падзел Рэчы Паспалітай і далучэнне ўсходняй часткі Беларусі да Расійскай імперыі.

Спробы рэформ палітычнага ладу. Чатырохгадовы сойм і прыняцце Канстытуцыі 3 мая 1791 г. Другі падзел Рэчы Паспалітай і далучэнне да Расіі цэнтральнай часткі Беларусі.

Паўстанне 1794 г. пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі, яго ход і вынікі. Трэці падзел Рэчы Паспалітай і далучэнне да Расіі заходняй часткі Беларусі.

Гісторыка-прававая ацэнка падзелаў Рэчы Паспалітай.

Культура беларускіх зямель у часы існавання Рэчы Паспалітай. Эпоха Асветніцтва і яе ўплыў на развіццё культуры і адукацыі. Складванне рэлігійных сістэм адукацыі ў другой палове XVI–XVIII ст. Віленская іезуіцкая акадэмія і калегіумы. Брацкія праваслаўныя і пратэстанцкія школы, іх кнігавыдавецкая дзейнасць. Дзейнасць Адукацыйнай камісіі. Развіццё рускай і лацінскай літаратуры.

Архітэктура, выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва эпохі барока. Асаблівасці Віленскага барока. Класіцызм.

### *План семінара № 4*

## БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ АД ЛЮБЛІНСКАЙ УНІІ (1569 г.) ДА ПАДЗЕЛАЎ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ (КАНЕЦ XVIII ст.)

**(2 гадзіны)**

### План

1. Люблінская унія і ўтварэнне Рэчы Паспалітай. Умовы аб’яднання ВКЛ і Польшчы.
2. Дзяржаўны лад Рэчы Паспалітай. Становішча Вялікага Княства Літоўскага ў палітычнай сістэме Рэчы Паспалітай.
3. Царкоўна-рэлігійныя адносіны на беларускіх землях у часы Рэчы Паспалітай.
4. Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у складзе Рэчы Паспалітай.
5. Знешняя палітыка Рэчы Паспалітай. Войны другой паловы XVI–XVIII ст.

6. Палітычны крызіс Рэчы Паспалітай, спробы рэформ у другой палове XVIII ст. Падзелы Рэчы Паспалітай і далучэнне беларускіх зямель да Расійскай імперыі.

7. Культура беларускіх зямель у складзе Рэчы Паспалітай.

### *Каралі Рэчы Паспалітай*

Сігізмунд (Жыгімонт) II Аўгуст (1548–1569–1572); Генрых Валуа (1573–1574); Стэфан Баторый (1576–1586); Сігізмунд (Жыгімонт) III Ваза (1587–1632); Уладзіслаў IV Ваза (1632–1648); Ян II Казімір Ваза (1648–1668); Міхаіл Карыбут Вішнявецкі (1669–1673); Ян III Сабескі (1674–1696); Аўгуст II Моцны (1697–1733); Аўгуст III Саксонскі (1733–1763); Станіслаў Аўгуст Панятоўскі (1764–1795).

### *Іншыя палітічныя дзеячы*

Мікалай Радзівіл Чорны, Мікалай Радзівіл Руды, Леў Сапега, Петр Скарга, Іасафат Кунцэвіч, Ілжэдзмітрый I, Міхаіл Фёдаравіч Раманаў, Багдан Хмяльніцкі, Міхайла Крычэўскі, Аляксей Міхайлавіч, Карл X Густаў, Януш Радзівіл, Багуслаў Радзівіл, Пацы, Сапегі, Агінскія, Пётр I, Карл XII, Станіслаў Ляшчынскі, Васіль Вашчыла, Антоній Тызенгаўз, Кацярына II, Аляксандр Сувораў, Тадэвуш Касцюшка, Якуб Ясінскі.

***Асноўныя паняцці, што тычацца дзяржаўнага і палітычнага ладу Рэчы Паспалітай:*** Люблінская унія (1569), Кейданская унія (1655), паланізацыя, «залатыя шляхецкія вольнасці», «польскі народ шляхецкі», ідэалогія сарматызму (сарматызм), інкарпарацыя, федэрацыя, Кароль, Вальны сейм (сойм) (ардынарны, экстраардынарны, канвакацыйны, элекцыйны, каранацыйны, пацыфікацыйны), Пасольская ізба, Сенат, «Генрыхавы артыкулы», «Pacta conventa», «ліберум вета», канфедэрацыя (Сандамірская, Торуньская, Слуцкая, Барская, Таргавіцкая), дысідэнты, Канстытуцыя 3 мая 1791 г., «нямыя сеймы» (1717, Гродзенскі 1793), саслоўна-прадстаўнічая манархія; Расія, Швецыя, Аўстрыя, Прусія; шышы; казацкія загоны; касінеры, віленскія якабінцы, Найвышэйшая Літоўская рада, Дэпутацыя Вялікага Княства Літоўскага.

***Асноўныя паняцці, што тычацца грамадскага і сацыяльна-эканамічнага ладу:*** фальварак, фальваркава-паншчынная сістэма, сялянскія павіннасці (падымнае, паншчына, чынш, дзякла, гвалты, талокі, згоны, жарнавое, угайнае, ялавічнае, чопавае, вепраўшчына, куніца, гіберна, рэйтаршчына), Скарбавая камісія (1760–1770-я гг.), рэформы І. Храптовіча, рэформы А. Тызенгаўза, мануфактура (Свержэнская, налібокская, урэцкая, слуцкая, нясвіжская, карэліцкая), фабрыка, каралеўская эканомія, «персіярня» (Ян Маджарскі), канал Агінскага, Паланецкі ўніверсал (1794).

***Асноўныя паняцці, што тычацца царкоўна-рэлігійных адносін:*** Берасцейская (Брэстская) царкоўная унія (1596), уніяцтва, грэка-каталікі (уніяты), іезуіты, інквізіцыя, рэфармацыя, контррэфармацыя, евангелікі, пратэстантызм, лютэранства, кальвінізм, арыянства, цвінгліянства, дысідэнты, Марцін Лютэр, Жан Кальвін, Пётр Скарга, Іпацій Пацей, Іасафат Кунцэвіч, Мікалай Радзівіл Чорны, Сымон Будны, Васіль Цяпінскі.

### *Асноўныя падзеі*

1569 г. – Люблінская унія.
1579 г. – вызваленне Полацка ад рускіх войск.
1582 г. – Ям-Запольскі мірны дагавор.
1588 г. – прынятце 3-га Статута ВКЛ.
1596 г. – Брэсцкая царкоўная унія.
1600–1629 г. – вайна Рэчы Паспалітай са Швецыяй.
1605 г. – бітва пад Кірхгольмам.
1629 г. – Альтмаркскае перамір’е.
1609–1618 г. – вайна Рэчы Паспалітай з Расіяй.
1610–1612 г. – акупацыя Масквы войскамі Рэчы Паспалітай.
1618 г. – Дэўлінскае перамір’е.
Гарадскія паўстанні ў Рэчы Паспалітай:
1584 г. – каляндарны бунт у Полацку;
1606, 1610 г. – паўстанні ў Магілёве;
1615–1616 г. – паўстанні ў Мозыры і Мінску;
1623 г. – антыўніяцкае паўстанне ў Віцебску супраць Іасафата Кунцэвіча.
1632–1634 г. – вайна Расіі з Рэччу Паспалітай.
1634 г. – Палянаўскі мір.

1648–1651 г. – антыфеадальная казацка-сялянская вайна.

1649, 1651 г. – Лоеўскія бітвы.

1651 г. – Белацаркоўскі мір.

1654–1667 г. – вайна Расіі з Рэччу Паспалітай.

1655 г. – Кейданская унія.

1667 г. – Андросаўскае перамір’е.

1686 г. – «Вечны мір» паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай.

1700–1721 г. – Паўночная вайна Расіі і Швецыі.

1703 г. – стварэнне Генеральнай канфедэрацыі ВКЛ.

1704 г. – стварэнне Сандамірскай канфедэрацыі.

1706 г. – Альтранштацкі мір.

1708 г. – бітва пры Лясной.

1709 г. – Палтаўская бітва.

1715–1717 г. – грамадзянская вайна ў ВКЛ супраць караля.

1735, 1764 г. – першае і другое выгнанні раскольнікаў.

1740–1744 г. – Крычаўскае паўстанне пад кіраўніцтвам В. Вашчылы.

1767 г. – стварэнне дысідэнцкіх Торуньскай і Слуцкай канфедэрацый.

1768 г. – стварэнне каталіцкай Барскай канфедэрацыі.

1772 г. – першы падзел Рэчы Паспалітай.

1788–1792 г. – рэформы Чатырохгадовага сойма.

1791 г., 3 мая – прыняцце Канстытуцыі Рэчы Паспалітай.

1792 г. – стварэнне Таргавіцкай канфедэрацыі праціўнікамі канстытуцыі.

1793 г. – другі падзел Рэчы Паспалітай.

1794 г. – паўстанне пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі.

1794 г., 7 мая – Паланецкі ўніверсал.

1795 г. – трэці падзел Рэчы Паспалітай.

### *Культура Беларускіх зямель у час існавання Рэчы Паспалітай (сярэдзіна XVI–канец XVIII ст.)*

***Архітэктура, выяўленчае мастацтва:*** барока, віленскае барока, ракако, класіцызм, сармацкі партрэт, беларускі іканапіс, кафля, фарны касцёл у Нясвіжы, Нясвіжскі палац, Сафійскі сабор у Полацку, Мінскі касцёл і кляштар бернардзінак, фарны іезуіцкі касцёл у Гродна, Дж. Бернардоні, Я. Шміт, Я. Глаўбіц, М. Пепельман, Дж. Сака.

***Дзеячы навукі і культуры:*** Філон Кміта-Чарнабыльскі, Фёдар Еўлашоўскі, Спірыдон Собаль, Лаўрэнцій Зізаній, Афанасій Філіповіч, Мялецій Сматрыцкі, Сімяон Полацкі, Ілля Капіевіч, Казімір Лышчынскі, Казімір Семяновіч, Георгій Каніскі, Саламея Русецкая, Францішка Урсула Радзівіл, Міхаіл Казімір Агінскі, Міхаіл Клеафас Агінскі, Жан Жылібер, Каэтан Марашэўскі, Міхаіл Цяцерскі, Марцін Пачобут-Адляніцкі.

***Адукацыя і навука:*** асветніцтва, Віленская іезуіцкая акадэмія, іезуіцкія калегіумы, брацкія школы, Галоўная Літоўская школа, Адукацыйная камісія, фізіякраты.

## Пытанні для абмеркавання і разважання

*1. Ахарактарызуйце наступствы Люблінскай уніі для развіцця беларускага этнасу, назавіце як адмоўныя, так і станоўчыя бакі гэтай падзеі.*

*2. Што можна сказаць пра тып дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай? Якія прычыны прывялі да палітычнага крызісу і знікнення Рэчы Паспалітай у XVIII ст.? Ці была магчымасць захаваць існуючы лад?*

*3. Ці можна назваць Рэч Паспалітую талерантнай у рэлігійным плане? Як адносіны паміж рознымі канфесіямі паўплывалі на палітычнае, сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё беларускіх зямель у гэты час?*

*4. Якія рысы капіталізму сталі з'яўляцца ў XVIII ст. у Рэчы Паспалітай? Чаму развіццё буржуазных адносін ішло марудней, чым у Еўропе?*

*5. У чым сутнасць эпохі Асветніцтва, якім чынам яна паўплывала на развіццё адукацыі, навукі, грамадскай думкі Беларусі?*

*6. Вызначыце асаблівасці стылю барока ў мастацтве таго часу. Якія помнікі архітэктуры і выяўленчага мастацтва дайшлі да нашага часу і якое значэнне яны маюць для культуры Беларусі?*

## Тэмы рэфератаў

1. Гістарычныя партрэты: Стафан Баторый, Леў Сапега, Станіслаў Панятоўскі, Тадэвуш Касцюшка.
2. Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі ў 1648–1667 гг. і іх наступствы для беларускіх зямель.

3. Паўстанне 1794 г. пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі, яго ход і вынікі.

4. Рэч Паспалітая ў еўрапейскіх канфліктах XVIII ст.

5. Распрацоўка і прыняцце Статута ВКЛ 1588 г.

6. Прыватныя тэатры на Беларусі.

7. Слуцкія паясы – шэдэўры беларускага мастацтва.

8. Нясвіж і Радзівілы ў XVI–XVIII ст.

9. Казімір Семяновіч – інжынер, тэарэтык артылерыі, гуманіст.

10. Культурна-асветніцкая дзейнасць іезуітаў на землях Беларусі.

11. Уніяцкая царква ў нацыянальна-культурным жыцці беларусаў.

## Літаратура

Асветнікі зямлі Беларускай. X–пачатак XX ст.: энцыклапедычны даведнік. – Мінск: БелЭн, 2006.

Баландзін, К.І. Культурнае развіццё Беларусі ў XVII–XVIII стагоддзях: вучэбны дапаможнік / К.І. Баландзін. – Мінск: БДПА, 1994.

Барышев, Г.И. Театральная культура Белоруссии XVIII в. / Г.И. Барышев. – Минск: Навука і тэхніка, 1992.

Гарэцкі, М. Гісторыя беларускай літаратуры / М. Гарэцкі. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1992.

Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва, 2000–2008. – Т. 3: Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII–XVIII стст.) / рэд. Ю. Бохан, П. Лойка. – Мінск: Экаперспектыва, 2007.

Гісторыя беларускага мастацтва: у 6 т. / рэдкал.: С.В. Марцэлеў [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1988. – Т. 2.

Дзмітрачкоў, П.Ф. Беларусь у другой палове XVII–XVIII ст.: вучэбны дапаможнік / П.Ф. Дзмітрачкоў, В.Л. Маразевіч. – Магілёў: МДУ імя А.А. Куляшова, 2000.

Ермаловіч, М.І. Беларуская дзяржава Вялікае Княства Літоўскае / М.І. Ермаловіч. – Мінск: Беллітфонд, 2003.

Мальдзіс, А.В. Як жылі нашы продкі ў XVIII стагоддзі / А.В. Мальдзіс. – Мінск: ТАА «Лімарыус», 2001.

Марзалюк, І.А. Этнічны і канфесійны свет беларускага горада XVI–XVIII стст. (Этнаканфесійны склад насельніцтва, этнічныя і

канфесійныя стэрэатыпы беларускіх гараджан) / І.А. Марзалюк. – Магілёў: МДУ імя А.А. Куляшова, 2007.

Падокшын, С.А. Беларуская думка ў кантэксце гісторыі і культуры / С.А. Падокшын. – Мінск: Беларуская навука, 2003.

Падокшын, С.А. Унія. Дзяржаўнасць. Культура: філасофска-гістарычны аналіз / С.А. Падокшын. – Мінск: Бел. навука, 1998.

Парашкоў, С.А. Гісторыя культуры Беларусі: вучэбны дапаможнік / С.А. Парашкоў. – Мінск: Беларуская навука, 2004.

Снапкоўскі, У.Е. Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі: вучэбны дапаможнік: у 2 ч. – Мінск: БДУ, 2003. – Ч. 1.

Статут Вялікага Княства Літоўскага, 1588 г.: тэксты, даведкі, каментарыі. – Мінск: Беларусь, 2002.

Трусаў, А.А. Манументальнае дойлідства Беларусі XI–XVIII стст.: гісторыя будаўнічай тэхнікі / А.А. Трусаў. – Мінск: Лекцыя, 2001.

Уния в документах / сост.: В.А. Теплова, З.И. Зуева. – Минск: Лучи Софии, 1997.

Юхо, Я.А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: у 2 ч. / Я.А. Юхо. – Мінск: РІВШ, 2003. – Ч. 1.

## Тэма 5. БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў ЧАС СТАНАЎЛЕННЯ ІНДУСТРЫЯЛЬНАЙ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ Ў СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ Ў КАНЦЫ XVIII–ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XIX ст.

**(2 гадзіны)**

Тэрыторыя і насельніцтва. Адміністрацыйны падзел. Сацыяльная і нацыянальна-рэлігійная структура насельніцтва. Яе асаблівасці. Катэгорыі сялян. Становішча і склад гарадскога насельніцтва.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё. Разлажэнне феадальна-прыгонніцкага ладу і фарміраванне капіталістычных адносін. Развіццё таварнай вытворчасці ў сельскай гаспадарцы. Пачатак яе спецыялізацыі. Новыя з’явы ў агратэхніцы. Структура і формы арганізацыі прамысловай вытворчасці. Вотчынныя і купецкія мануфактуры. Рост выкарыстання наёмнай працы. Будаўніцтва дарог і каналаў. Гандаль. Кірмашы. Узрастанне ролі гарадоў і мястэчкаў.

Вайна 1812 г. і Беларусь. Расійска-французскія адносіны і палітычная сітуацыя ў заходніх губернях напярэдадні вайны. Праект адраджэння Вялікага Княства Літоўскага. Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі летам 1812 г. Палітыка французскіх улад. Дзейнасць Часовай камісіі ўрада Вялікага Княства Літоўскага. Адносіны шляхты да Напалеона. Пазіцыі сялянства. Партызанскі рух. Удзел насельніцтва Беларусі ў баявых дзеяннях. Разгром французскіх войскаў на Бярэзіне. Вынікі вайны для Беларусі.

«Польскае пытанне» і ўрадавая палітыка. Эвалюцыя саслоўнай палітыкі. Ваенныя пасяленні. Актуалізацыя сялянскага пытання ў другой чвэрці XIX ст. Люстрацыя дзяржаўных маёнткаў. Інвентарная рэформа. Канфесіянальная палітыка. Полацкі царкоўны сабор і яго вынікі. Змяненні палітыкі ў галіне асветы. Заканадаўства. Камітэт заходніх губерняў і яго дзейнасць. Русіфікацыя і яе сутнасць.

Грамадска-палітычнае жыццё і яго накірункі. Тайныя таварыствы вучнёўскай моладзі і іх дзейнасць. Дзекабрысты. Беларусь у планах дзекабрыстаў. Бабруйскі план паўстання. «Таварыства ваенных сяброў». Выступленне дзекабрыстаў у Літоўскім корпусе і ў Бабруйскай крэпасці. Разгром тайных таварystваў.

Шляхецкае паўстанне 1830–1831 гг. Яго мэты і праграма дзеянняў. Развіццё паўстання ў заходніх і паўднёвых раёнах Беларусі. Мабілізацыя сялян і мяшчан. Бітва за Вільню. Падаўленне паўстання.

«Дэмакратычнае таварыства». Ф. Савіч. «Саюз свабодных братоў». Зараджэнне беларускага нацыянальна-культурнага руху.

«Заходнерусізм» і яго прадстаўнікі: мітрапаліт літоўскі І. Сямашка, І. Грыгаровіч і інш.

Культура. Рамантызм і асветніцтва. Фарміраванне сістэмы свецкай і духоўнай адукацыі. Віленская навучальная акруга. Віленскі ўніверсітэт. Гімназіі. Павятовыя вучылішчы. Царкоўнапрыходскія школы. Змены ў сістэме адукацыі. Беларуская навучальная акруга. Горы-Горацкі земляробчы інстытут. Віцебская настаўніцкая семінарыя. Духоўная адукацыя. Полацкая езуіцкая акадэмія. Ваеннае і прафесійнае навучанне. Зараджэнне і развіццё археаграфіі, крыніцазнаўства, славяназнаўства, беларусазнаўства, этнаграфіі і археалогіі. Прыродазнаўчыя веды: батаніка, біялогія, фізіялогія, хімія. Станаўленне новай беларускай мовы і літаратуры. Рамантызм: Адам Міцкевіч, Ян Чачот, Уладзіслаў Сыракомля, Ян Баршчэўскі. Пераход да рэалізму. Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч. Ананімная паэзія. Мастацтва. Тэатр. Музыка. А. Абрамовіч, М. Агінскі, Д. Стэфановіч, С. Манюшка. Архітэктура і горадабудаўніцтва. Палацава-сядзібнае будаўніцтва. Класіцызм. Неаготыка. Жывапіс. Віленская школа жывапісу. Я. Дамель, І. Аляшкевіч, В. Ваньковіч, І. Хруцкі, В. Дмахоўскі. Графіка. Скульптура.

## Тэма 6. БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў ПЕРЫЯД СТАНАЎЛЕННЯ І РАЗВІЦЦЯ БУРЖУАЗНАГА ГРАМАДСТВА Ў СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ (ДРУГАЯ ПАЛОВА XIX–ПАЧАТАК XX ст.)

**(2 гадзіны)**

Фарміраванне сацыяльнай структуры буржуазнага грамадства, незавершанасць гэтага працэсу ў Беларусі. Мадэрнізацыя і працэсы індустрыялізацыі, урбанізацыі, станаўлення нацыі, змены ў менталітэце беларускага грамадства.

Адмена прыгоннага права. Рэскрыпт У. І. Назімаву. Маніфест і «Палажэнні» 19 лютага 1861 г. Спецыфіка мясцовых «Палажэнняў»

для Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай, Гродзенскай і Віленскай губерняў. Правы сялян. Змены ў рэалізацыі рэформы, звязаныя з паўстаннем 1863 г. Рэформы аграрных адносін дзяржаўных сялян і ўпарадкаванне іншых катэгорый сельскага насельніцтва. Вынікі і значэнне аграрных рэформ.

Буржуазныя рэформы 60–70-х гг. Ваенная, школьная, цэнзурная, судовая, гарадскога самакіравання рэформы, іх прычыны, сутнасць і асаблівасці рэалізацыі ў Беларусі. Значэнне рэформ. Контррэформы і іх вынікі. Увядзенне інстытута земскіх начальнікаў. Русіфікацыя Беларусі. Пашырэнне ўплыву праваслаўнай царквы.

Сельская гаспадарка. Памешчыцкае і сялянскае землеўладанне. Асаблівасці буржуазнай эвалюцыі сельскай гаспадаркі Беларусі. Аграрны крызіс 80-х гг. і яго ўплыў на рыначную спецыялізацыю сельскай гаспадаркі. Малочная і мясная жывёлагадоўля. Вытворчасць тэхнічных культур. Вінакурэнне. Становішча сялян. Фарміраванне аграрнай буржуазіі. Адыходныя промыслы. Развіццё капіталізму ў сельскай гаспадарцы. Феадальна-прыгонніцкія перажыткі ў беларускай вёсцы, сацыяльная дыферэнцыяцыя сялянства. Аграрная перанаселенасць, міграцыя вясковага насельніцтва.

Прамысловасць і гарады. Спецыялізацыя беларускай прамысловасці, яе галіновая структура. Спецыфічныя рысы тэрытарыяльнага размяшчэння прамысловых прадпрыемстваў. Асаблівасці прамысловай рэвалюцыі ў Беларусі. Удзельная вага дробнай вытворчасці. Рост гарадоў і іх добраўпарадкаванне. Асаблівасці ўрадавай палітыкі ў дачыненні горадаўтварэння. Мястэчкі. Фарміраванне гандлёва-прамысловай буржуазіі. Колькасць, склад, становішча рабочых. Прамысловы крызіс у Беларусі 1900–1903 гг. Рост акцыянернага капіталу, банкі Беларусі. Пранікненне замежнага капіталу ў эканоміку Беларусі.

Транспарт, гандаль, фінансы. Будаўніцтва чыгунак. Важнейшыя чыгуначныя лініі ў Беларусі; іх уплыў на развіццё сельскай гаспадаркі, прамысловасці, гарадоў і гандлю. Рачны транспарт. Фарміраванне фінансава-крэдытнай сістэмы. Дзейнасць у Беларусі аддзяленняў Дзяржаўнага, Сялянскага, Дваранскага і іншых банкаў. Скарачэнне кірмашоў і развіццё магазінна-крамнага гандлю. Фарміраванне на тэрыторыі Беларусі адзінага эканамічнага рэгіёна.

Паўстанне 1863–1864 гг. Прычыны паўстання. «Чырвоныя» і «белыя». Кастусь Каліноўскі і яго дзейнасць. «Мужыцкая праўда».

Арганізацыя паўстанцкіх атрадаў і іх дзейнасць на тэрыторыі Беларусі. Тактыка «белых». Меры царскай адміністрацыі ў сувязі з паўстаннем. М. Мураўёў. Спад паўстанцкага руху. Утварэнне Літоўска-Беларускага чырвонага жонду. Падаўленне паўстання. «Лісты з-пад шыбеніцы» Кастуся Каліноўскага. Характар і прычыны паражэння паўстання.

Грамадска-палітычнае жыццё. Грамадская думка: асноўныя плыні і іх эвалюцыя. Ідэалогія манархізму ў Беларусі. «Заходнерусізм» і яго плыні. М. Каяловіч. Станаўленне ліберальнай думкі. Вытокі ідэалогіі беларускага нацыянальнага руху. Ф. Багушэвіч. К. Каліноўскі.

Вытокі і сутнасць народніцтва. Першыя народніцкія гурткі пачатку 70-х гг. і іх дзейнасць. Народніцкія гурткі другой паловы 70-х гг. Пераход на пазіцыі «Народнай волі». Выхадцы з Беларусі ў народніцкіх арганізацыях Расіі. Народніцкія арганізацыі ў Беларусі ў першай палове 80-х гг. Група «Гоман» і яе погляды на развіццё Беларусі. Ліберальныя народнікі.

Эвалюцыя рабочага руху. Распаўсюджванне марксізму. Дзейнасць сацыял-дэмакратыі Польшчы і Літвы. Усеагульны яўрэйскі рабочы саюз (Бунд). I з’езд РСДРП. Утварэнне і дзейнасць Беларускай сацыялістычнай грамады.

Фарміраванне беларускай нацыі. Умовы ўтварэння беларускай нацыі. Этнічная тэрыторыя беларусаў, нацыянальны склад насельніцтва. Сацыяльна-класавыя асаблівасці станаўлення беларускай нацыі. Фарміраванне агульных нацыянальных прыкмет. Этнічная і нацыянальная самасвядомасць. Станаўленне беларускай літаратурнай мовы. Самавызначэнне беларускага нацыянальнага руху.

Культура Беларусі ў 60–90-я гг. Асноўныя стылі і накірункі ў развіцці культуры. Асвета. Палітыка ўрада ў галіне школьнай справы. Пачатковая і сярэдняя адукацыя. Тыпы і колькасць школ. Узнікненне прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Настаўніцкія семінарыі. Развіццё прыродазнаўчых навук. Вывучэнне этнаграфіі, гісторыі і культуры Беларусі. Публікацыя гістарычных крыніц і помнікаў духоўнай культуры. Развіццё мастацкай літаратуры. Творчасць Ф. Багушэвіча, А. Гурыновіча, Янкі Лучыны, Каруся Каганца і інш. Тэатр і музыка. Архітэктура і горадабудаўніцтва. Змяненне выгляду беларускіх гарадоў. Эклектыка. Жывапіс. Гістарычны і бытавы жанры. Партрэт. Графіка.

## Тэма 7. БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў ПЕРЫЯД САЦЫЯЛЬНЫХ УЗРУШЭННЯЎ У ПАЧАТКУ ХХ ст. (частка 1)

**(1 гадзіна)**

Рэвалюцыйныя падзеі 1905—1907 гг. у Беларусі. Абвастрэнне сацыяльных і нацыянальных супярэчнасцей. Пачатак рэвалюцыі. Уздым выступленняў рабочых, сялян і салдат у студзені–верасні 1905 г. Кастрычніцкая палітычная стачка ў гарадах і мястэчках Беларусі. Маніфест 17 кастрычніка 1905 г. Курлоўскі расстрэл у Мінску. Снежаньскія падзеі ў Беларусі. Адступленне рэвалюцыі. Выбарчы закон ад 11 снежня 1905 г., адносіны да яго палітычных партый і арганізацый у Беларусі. Выбары ў I і II Дзяржаўныя думы Расіі, сацыяльны і партыйны склад дэпутатаў ад беларускіх губерняў, іх пазіцыі па пытаннях эканамічнага і палітычнага жыцця краіны. Прычыны роспуску I і II Дзяржаўных дум. Уздым рабочага, сялянскага і салдацкага рухаў вясной–летам 1906 г., змены ў іх дынаміцы і характары. Рэвалюцыйныя хваляванні ў Беларусі вясной 1907 г. Прычыны паражэння першай расійскай рэвалюцыі.

Беларускі нацыянальны рух у перыяд рэвалюцыі 1905–1907 гг., роля БСГ. Праграмныя ўстаноўкі БСГ, яе адносіны да I і II расійскіх Дум. II з’езд БСГ. Рашэнні чэрвеньскай (1906) канферэнцыі БСГ. Газеты «Наша доля» і «Наша ніва», іх роля ў развіцці нацыянальна-вызваленчага руху.

Сталыпінскія рэформы. Прычыны правядзення аграрнай рэформы, яе мэты і задачы. Скасаванне сельскай абшчыны. Насаджэнне хутароў і атрубоў. Перасяленне сялян у азіяцкую частку Расіі. Далейшая спецыялізацыя сельскай гаспадаркі і рост вытворчасці. Узмацненне сацыяльнай дыферэнцыяцыі беларускай вёскі. Вынікі сталыпінскай аграрнай рэформы для Беларусі.

Прычыны і мэты правядзення земскай рэформы ў беларускіх губернях, яе асаблівасці. «Палажэнне аб земскіх установах» ад 27 сакавіка 1911 г. Губернскія і павятовыя земскія ўправы і іх роля ў арганізацыі мясцовага кіравання і гаспадарчага жыцця. Значэнне ўвядзення земстваў у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях.

Эканамічнае развіццё і грамадска-палітычнае жыццё Беларусі ў 1907–1914 гг. Уздым прамысловасці. Рост канцэнтрацыі вытворчасці.

Становішча рабочага класа. Сельская гаспадарка. Сацыяльныя зрухі ў вёсцы. Падаткі і павіннасці сялян.

Палітычныя пазіцыі ўрадавых партый і арганізацый, ліберальны рух, аслабленне рэвалюцыйных партый і арганізацый. Дынаміка і характар рабочага і сялянскага рухаў. Грамадска-палітычны рух у Беларусі ў час выбараў у III і IV Дзяржаўныя думы. Дэпутаты ад беларускіх губерняў у III і IV Думах і іх пазіцыі па пытаннях палітычнага і эканамічнага жыцця краіны.

Беларускі нацыянальна-вызваленчы рух. Барацьба самадзяржаўя з беларускім нацыянальна-адраджэнскім рухам. «Наша ніва».

Культура Беларусі. Умовы і асаблівасці культурнага развіцця Беларусі. Палітыка царызму ў Беларусі ў галіне культуры. Ідэалогія і практыка «заходнерусізму».

Перыядычны друк і выдавецкая справа. Школа, асвета і адукацыя, навука і навуковыя даследаванні. Развіццё беларусазнаўства. Я. Карскі, М. Доўнар-Запольскі, В. Ластоўскі і інш. Тэхнічная інтэлігенцыя. Развіццё літаратуры і мастацтва. М. Багдановіч, Янка Купала, Якуб Колас і інш. Выяўленчае мастацтва. В. Бялыніцкі-Біруля. Архітэктура. Беларускі тэатр і музыка. І. Буйніцкі.

Беларусь у гады Першай сусветнай вайны. Прычыны і пачатак вайны. Увядзенне ваеннага становішча ў Беларусі. Адносіны да вайны розных груп насельніцтва, палітычных партый і грамадскіх арганізацый. Ваенныя дзеянні на германска-расійскім (Усходнім) фронце ў 1914–1915 гг. Свянцянскі прарыў. Стабілізацыя фронту ў кастрычніку 1915 г. Захоп Заходняй Беларусі войскамі кайзераўскай Германіі. Беларускія тэрыторыі ў складзе Обер-Оста, устанаўленне акупацыйнага рэжыму на захопленай тэрыторыі. Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі ў 1916 г. Нарачанская і Баранавіцкая ваенныя аперацыі. Колькасць, асноўныя месцы рассялення бежанцаў з Беларусі ў расійскіх губернях. Стварэнне і дзейнасць грамадскіх арганізацый бежанцаў і камітэтаў дапамогі ахвярам вайны.

Становішча на неакупіраванай тэрыторыі Беларусі: прамысловасць, сельская гаспадарка, мілітарызацыя эканомікі, размяшчэнне расійскіх войскаў. Ваенныя павіннасці. Харчовы крызіс.

Палітыка нямецкай акупацыйнай адміністрацыі. Беларускі нацыянальны рух у гады вайны. Школа і культурна-асветніцкая справа ва ўмовах нямецкай акупацыі ў 1915–1916 гг.

Беларусь у час Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. Перамога рэвалюцыі ў Петраградзе. Падзеі Лютаўскай рэвалюцыі ў Беларусі і на Заходнім фронце. Звяржэнне самадзяржаўя. Стварэнне органаў Часовага ўрада, саветаў, салдацкіх камітэтаў у Беларусі і на Заходнім фронце і іх дзейнасць. Асаблівасці палітычнага становішча ў Беларусі. Палітычная дыферэнцыяцыя грамадства. І з'езд ваенных і рабочых дэпутатаў арміі і тылу Заходняга фронту. З'езды сялянскіх дэпутатаў. Наступленне на франтах і яго вынікі. Ліпеньскія падзеі. Канец двоеўладдзя.

### *План семінара № 5*

## ПАЛІТЫЧНАЕ, САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ І КУЛЬТУРНАЕ РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ У СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ (КАНЕЦ XVIII–ПАЧАТАК XX ст.)

**(2 гадзіны)**

### План

1. Этапы і змест палітыкі расійскага ўрада на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII–пачатку XX ст. Буржуазныя рэформы 60–70-х гг. XIX ст.: асаблівасці іх правядзення ў Беларусі. Контррэформы.
2. Вайна 1812 г. і Беларусь.
3. Грамадска-палітычны рух на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII–пачатку XX ст. (студэнцкі рух, дзекабрысцкі рух, шляхецкае паўстанне 1830–1831 гг., паўстанне 1863–1864 гг., народнікі, сацыял-дэмакраты, беларускі нацыянальны рух).
4. Гаспадарка беларускіх зямель у канцы XVIII–пачатку XX ст. Эканамічныя рэформы 1830–1840-х гг. Адмена прыгоннага права. Сталыпінская аграрная рэформа і асаблівасці яе правядзення ў Беларусі.
5. Беларускія землі ў перыяд сацыяльных узрушэнняў у пачатку XX ст. (рэвалюцыя 1905–1907 гг., Першая сусветная вайна, Лютаўская рэвалюцыя 1917 г.).
6. Культура беларускіх губерняў у складзе Расійскай імперыі ў канцы XVIII–пачатку XX ст.

## *Імператары Расійскай імперыі*

Кацярына II (1762–1796 гг.), Павел I (1796–1801 гг.), Аляксандр I (1801–1825 гг.), Мікалай I (1825–1855 гг.), Аляксандр II (1855–1881 гг.), Аляксандр III (1881–1894 гг.), Мікалай II (1894–1917 гг.).

***Асноўныя паняцці і асобы, якія адносяцца да палітычнага развіцця беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі:*** адміністрацыйна-тэрытарыяльныя падзелы (1796–1797 гг., 1802 г.), саслоўі (прывілеяваныя, падатковыя, непадатковыя), паланізацыя, русіфікацыя, «Даравальная грамата гарадам» (1785 г.), канфесія, Беларуская каталіцкая епархія, ваенныя паселішчы, Камітэт заходніх губерняў (1831 г.), канфіскацыя, «разбор шляхты», мяжа яўрэйскай аселасці (1794 г.), Полацкі царкоўны сабор (1839 г.), секулярызацыя, заходнерусізм, рэформы, контррэформы, ваенная рэформа 1862 г. (усеагульная воінская павіннасць), судовая рэформа 1872 г. (прысяжныя засядацелі, прысяжныя павераныя, міравыя суды, акруговыя суды), гарадская рэформа 1875 г. (гарадская ўправа, маёмасны цэнз), школьная рэформа 1864 г. (бессаслоўнасць у адукацыі, класічныя і рэальныя гімназіі), цэнзурная рэформа 1865 г., земская рэформа 1911 г. (земствы), контррэформы Аляксандра III.

***Асобы:*** І. Сямашка, М. Мураўёў, П. Сталыпін.

***Асноўныя паняцці, тэрміны вайны 1812 г.:*** Тыльзіцкі мір, Герцагства Варшаўскае, план Агінскага, Камісія Часовага ўрада ВКЛ, Ухалоды, Студзёнка, Жарцы.

***Асобы:*** Напалеон, Аляксандр I, Дамінік Радзівіл, М.К. Агінскі, Ф.К. Любецкі, Л. Плятэр, М.Б. Барклай дэ Толі, П.І. Баграціён, А.П. Тармасаў, С. Солтан, М. Раеўскі, Я.П. Кульнёў, Н. Дурава, М. Маркаў.

## *Асноўныя паняцці і асобы, якія адносяцца да грамадска-палітычнага руху на тэрыторыі беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі*

• ***Студэнцкі рух:*** Віленская асацыяцыя (1796–1797 гг.), філаматы (1817–1820 гг.), філарэты (1820–1823 гг.), Дэмакратычнае таварыства (1836–1839 гг.), Саюз свабодных братоў.

***Асобы:*** А. Міцкевіч, Т. Зан, Я. Чачот, Ф. Савіч.

• ***Дзекабрысцкі рух:*** Таварыства ваенных сяброў (1825 г.), Таварыства з'яднаных славян.

Асобы: М. Мураўёў, С. Мураўёў-Апостал, М. Рукевіч, С. Трусаў.

• ***Шляхецкае паўстанне 1830–1831 гг.:*** Віленскі цэнтральны паўстанцкі камітэт, кансерватары і дэмакраты, «За нашу і вашу свабоду».

***Асобы:*** А. Чартарыйскі, І. Лялевель.

• ***Паўстанне1863-1864 гг.:*** Цэнтральны нацыянальны камітэт, Літоўскі правінцыяльны камітэт, Адзел кіраўніцтва правінцыямі Літвы, «Беларуска-літоўскі чырвоны жонд», «белыя» і «чырвоныя», «левыя» і «правыя».

***Асобы:*** К. Каліноўскі, З. Серакоўскі, Л. Звяждоўскі, В. Урублеўскі, Ф. Ражанскі, Р. Гершуні.

• ***Народнікі:*** «хаджэнне ў народ», «Зямля і воля» (1876–1879 гг.), «Чорны перадзел» (1879-1882 гг.), «Народная воля» (1879 г.), група «Гомон» (1884 г., Пецярбург), ліберальныя народнікі, палітычны тэрор.

***Асобы:*** І. Грынявіцкі, М. Судзілоўскі, С. Кавалік, Р. Ісаеў, К. Брэшка-Брэшкоўская, Г. Пляханаў, А. Марчанка, Х. Ратнер.

• ***Марксізм і сацыял-дэмакратычны рух:*** марксізм, сацыялізм, «Пралетарыят» (1882 г.), «Вызваленне працы» (1883 г.), Усеагульны яўрэйскі саюз у Літве, Польшчы і Расіі – Бунд (1897 г., Вільня), Расійская сацыял-дэмакратычная рабочая партыя – РСДРП (1898 г., Мінск), партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў – эсэры (1902 г.).

***Асобы:*** Э. Абрамовіч, І. Гурвіч, С. Трусевіч, Я. Спонцы, В. Сяліцкі, А. Крэмер, У. Ленін, Л. Мартаў.

• ***Ліберальна-буржуазны рух:*** кадэты, акцябрысты.

***Асобы:*** А. Гучкоў, П. Мілюкоў.

• ***Манархічны лагер:*** чарнасоценцы, Рускі ўскраінны саюз, Саюз рускага народа.

• ***Беларускі нацыянальны рух:*** беларуская нацыянальная ідэя, Беларуская сацыялістычная грамада – БСГ (канец 1902–пач. 1903 г.).

***Асобы:*** І. і А. Луцкевічы, В. Іваноўскі, А. Пашкевіч (Цётка), К. Кастравіцкі (Карусь Каганец), А. Бурбіс.

• ***Рэвалюцыя 1905–1907 гг.:*** «крывавая нядзеля», Булыгінская дума (6 жніўня 1905 г.), Усерасійская Кастрычніцкая палітычная стачка 1905 г., Маніфест Мікалая II ад 17 кастрычніка 1917 г., аўтанамісты, Дзяржаўная Дума, Курлоўскі расстрэл (18 кастрычніка 1905 г.), Снежаньскае ўзброеннае паўстанне 1905 г., Трэцячэрвеньскі дзяржаўны пераварот 1907 г.

***Асобы:*** Г. Гапон, Р. Скірмунт, П. Курлоў, П. Сталыпін.

• ***Лютаўская рэвалюцыя 1917 г.:*** адрачэнне ад трону, двоеўладдзе, Петраградскі Савет рабочых і сялянскіх дэпутатаў, Часовы ўрад, Мінскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў, грамадскія камітэты парадку, Беларускі нацыянальны камітэт, карнілаўскі мяцеж.

***Асобы:*** Р. Скірмунт, А. Керанскі, Л. Карнілаў, М. Фрунзэ.

***Асноўныя паняцці і асобы, якія адносяцца да сацыяльна-эканамічнага развіцця беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі:*** феадальна-прыгонніцкая сістэма, аброк, чынш, паншчына, рэкрутчына, інвентарная рэформа, рэформа ў дзяржаўнай вёсцы, люстрацыя, трохпольная сістэма, шматпольны севазварот, Беларускае вольнае эканамічнае таварыства (1826–1841 гг.), падворнае землекарыстанне, абшчыннае землекарыстанне, дробнатаварная вытворчасць, мануфактура, фабрыка, Хомск, Косава, «гасцінцы», Зэльва, Бешанковічы, адмена прыгоннага права (Сакрэтны камітэт, губернскія дваранскія камітэты, часоваабавязаныя сяляне, устаўныя граматы, «Мясцовыя палажэнні», выкупная аперацыя, выкупныя плацяжы, дзевяць і сорак дзевяць год, міравыя пасрэднікі, павятовыя міравыя з'езды, сельскія і валасныя праўленні, губернскія па сялянскіх справах прысутнасці, валасны сялянскі суд), капіталізм, прамысловая рэвалюцыя, пралетарыят, буржуазія, прускі і «амерыканскі» шляхі развіцця капіталізму, цераспалосіца, сервітуты, адпрацовачная сістэма, шматукладнасць эканомікі, манапалістычныя аб'яднанні, акцыянерныя таварыствы, абшчына, хутар, водруб.

***Асобы:*** П. Кісялёў, Ю. Бакшанскі, В. Пуслоўскі, У. Назімаў, Шарашэўскі, А. Стульгінскі, П. Сталыпін.

***Асноўныя паняцці, якія адносяцца да перыяду Першай сусветнай вайны на тэрыторыі Беларусі:*** ваеннае становішча, Стаўка Вярхоўнага галоўнакамандуючага (Баранавічы, Магілёў), Свянцянскі прарыў (27.08–19.09.1915 г.), Двінск–Паставы–Смаргонь–Баранавічы–Пінск, акупацыя, рэквізіцыі, падушны падатак, Нарачанская аперацыя (5–15.03.1916 г.), Баранавіцкая аперацыя (19.06–16.07.1916 г.), першае выкарыстанне на Усходнім фронце атрутнага газу (Смаргонь), Беларускае таварыства дапамогі ахвярам вайны (Вільня, 1915 г.; А. і І. Луцкевічы, В. Ластоўскі).

### *Культура беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі*

***Асноўныя паняцці:*** паланізацыя, русіфікацыя, беларусазнаўства, заходнерусізм, класіцызм, рамантызм, рэалізм.

***Архітэктурныя стылі і архітэктурныя пабудовы:*** класіцызм, эклектыка, готыка, псеўдарускі стыль, мадэрн; палац Румянцавых–Паскевічаў у Гомелі, Петрапаўлаўскі сабор у Гомелі, сабор Іосіфа ў Магілёве, капліца князёў Паскевічаў у Гомелі, Пакроўскі сабор у Гродне, Свята-Уваскрасенскі сабор у Барысаве, цэрквы-«мураўёўкі», касцёлы ў Відзах, Вілейцах, Іўі, Паставах, касцёл Святога Роха ў Мінску, касцёл Святых Сымона і Алены ў Мінску, гасцініца «Еўропа» ў Мінску.

***Адукацыя:*** Віленская навучальная акруга, Віленскі ўніверсітэт, Беларуская навучальная акруга, царкоўнапрыходскія школы, павятовыя вучылішчы, народныя і гарадскія вучылішчы, класічныя і рэальныя гімназіі, ланкастэрскія школы ўзаемнага навучання, езуіцкія калегіумы, Горы-Горацкая земляробчая школа, Маладзечанская настаўніцкая семінарыя, настаўніцкія інстытуты, Паўночна-Заходні аддзел Рускага геаграфічнага таварыства.

***Друк:*** «Мужыцкая праўда», «Гомон», «Минский листок», «Дзянніца», «Светач», «Загляне сонца і у наша ваконца», «Наша хата», «Мінчук», «Наша доля», «Наша ніва», «Вольная Беларусь», «Саха», «Лучынка», «Крапіва».

***Навука:*** Я. і А. Снядэцкія, К.Д. Шміт, П. Шпілеўскі, І. Грыгаровіч, Т. Нарбут, Я. і К. Тышкевічы, А. Кіркор, П. Шпілеўскі, Уладзіслаў Сыракомля, Я. Чачот, І. Дамейка, К. Чарноўскі, К. Шыльдэр, І. Насовіч, П. Шэйн, М. Каяловіч, І. Чэрскі, М. Баброўскі, М. Нікіфароўскі, Е. Раманаў, М. Доўнар-Запольскі, В. Ластоўскі, Я. Карскі, Я. Наркевіч-Ёдка.

***Літаратура:*** ананімная («Гутарка Данілы са Сцяпанам», «Вось які люд стаў», «Вясна гола перапала»), В. Равінскі («Энеіда навыварат»), К. Вераніцын («Тарас на Парнасе»), Я. Баршчэўскі («Дзеванька», «Рабункі мужыкоў», «Гарэліца», «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях»), П. Багрым («Зайграй, зайграй, хлопча малы …»), Уладзіслаў Сыракомля («Паштальён», «Добрыя весці», «Ужо птушкі пяюць усюды»), В. Дунін-Марцынкевіч («Сялянка», «Гапон», «Пінская шляхта»), А. Міцкевіч («Пан Тадэвуш», «Свіцязь», «Дзяды»), Ф. Багушэвіч (зборнікі «Дудка беларуская», «Смык беларускі»), Янка Лучына (зборнік «Вязанка», «Роднай старонцы»), А. Гурыновіч, М. Багдановіч (зборнік «Вянок»), Янка Купала («Мужык», зборнікі «Жалейка», «Гусляр», «Шляхам жыцця», паэмы «Курган», «Бандароўна», п’есы «Паўлінка», «Раскіданае гняздо»), Якуб Колас (зборнік «Песні жальбы»), Цішка Гартны («Сокі цаліны»), Цётка (зборнікі «Хрэст на свабоду», «Скрыпка беларуская»), Змітрок Бядуля.

***Жывапіс:*** І. Аляшкевіч (партрэт А. Чартарыйскага, магнатаў Л. Сапегі і М. Радзівіла, «Групавы партрэт», «Партрэт дзяўчынкі»), В. Ваньковіч («Напалеон каля вогнішча», партрэты Напалеона, А. Манюшкі, А.С. Пушкіна (не скончыў), «А. Міцкевіч на скале Аюдаг»), Я. Дамель («Смерць Глінскага ў няволі», «Вызваленне Т. Касцюшкі з цямніцы», «Адступленне французаў праз Вільню ў 1812 г.», «Смерць князя Панятоўскага», «Пераход Напалеона праз Беразіну»), В. Дмахоўскі ( «Радзіма», «Возера Свіцязь», «Заход сонца»), І. Хруцкі («Кветкі і садавіна», «Гародніна, грыбы і рыба», «Грыбы і агуркі»), Ю. Пешка (партрэты С. Манюшкі, Т. Радзівіла), К. Альхімовіч («Пахаванне Гедыміна», «Жніво», «Парабкава хата», «Найманне работнікаў»), Н. Орда (у Беларусі зрабіў каля 200 замалёўкаў, у тым ліку Камянецкай вежы, палацаў і замкаў у Міры, Навагрудку, Нясвіжы, Гродне, Лідзе), Н. Сіліванович («Дзеці на

двары», «У школу», «Стары пастух»), А. Гараўскі («Вечар у Мінскай губерні», «На радзіме», «Рака Бярэзіна»), В. Бялыніцкі-Біруля (увасабляў вобраз вясны, якой ён прысвяціў каля 200 сваіх палоцен), Ю. Пэн («Гадзіншчык»), І. Рэпін («Беларус»), Х. Суцін («Аўтапартрэт каля мальберта»).

***Тэатр:*** батлейка, тэатры народнай драмы, прыватныя тэатры (тэатры Радзівілаў у Нясвіжы і Слуцку, Зорыча ў Шклове, Агінскага ў Слоніме), аматарскія тэатры (В. Дунін-Марцінкевіч), беларускія вечарынкі, Беларускі музычна-драматычны гурток (А. Бурбіс), прафесійны тэатр (І. Буйніцкі).

***Музыка:*** С. Манюшка («Рэкруцкі набор», «Сялянка»), А. Абрамовіч («Беларускае вяселле»), М. К. Агінскі («Развітанне з Радзімай»), Д. і В. Стэфановічы, Мінскае музычнае таварыства.

### *Асноўныя падзеі*

1772, 1793, 1795 гг. – тры падзелы Рэчы Паспалітай і далучэнне беларускіх зямель да Расійскай імперыі.

1812 г. – вайна з Напалеонам.

1820-я гг. – будаўніцтва першых фабрык на тэрыторыі Беларусі.

1830–1831 гг. – шляхецкае паўстанне.

1829 г. – стварэнне Беларускай навучальнай акругі.

1832 г. – закрыццё Віленскага ўніверсітэта.

1831, 1840 гг. – увядзенне расійскага заканадаўства.

1839 г. – Полацкі царкоўны сабор, ліквідацыя ўніяцкай царквы.

1840–1857 гг. – правядзенне рэформы П.Д. Кісялёва ў дзяржаўнай вёсцы.

1844–1857 гг. – правядзенне інвентарнай рэформы ў памешчыцкай вёсцы.

1848 г. – стварэнне Горы-Горацкага земляробчага інстытута.

19 лютага 1861 г. – адмена прыгоннага права.

1862 г. – будаўніцтва першай чыгункі на тэрыторыі Беларусі.

1863–1864 гг. – шляхецкае нацыянальна-вызваленчае паўстанне ў Польшчы, Літве і Беларусі.

1861–1882 – буржуазныя рэформы (ваенная, судовая, земская, гарадская, школьная, цэнзурная).

1884 г. – стварэнне беларускімі студэнтамі-народнікамі групы «Гомон» у Санкт-Пецярбурзе.

1897 г. – стварэнне партыі Бунд (першы з’езд у Вільні).

1898 г. – Першы з’езд РСДРП у Мінску.

1902 г. – стварэнне партыі эсэраў (ПСР).

Зіма 1902–1903 гг. – стварэнне Беларускай сацыялістычнай грамады.

1905–1907 гг. – першая расійская рэвалюцыя.

1906 г. – пачатак аграрнай рэформы П.А. Сталыпіна.

1910–1913 гг. – дзейнасць першага беларускага нацыянальнага прафесійнага тэатра пад кіраўніцтвам І. Буйніцкага.

1911 г. – увядзенне земстваў у Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях.

1914–1918 гг. – Першая сусветная вайна.

1917 г. – Лютаўская рэвалюцыя.

## Пытанні для абмеркавання і разважання

*1. Вызначце асноўныя этапы палітыкі расійскага ўрада на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII–пачатку XX ст. і растлумачце, чым абумоўлены такі падзел. Ахарактарызуйце сутнасць палітыкі расійскіх уладаў на кожным этапе.*

*2. Зрабіце параўнаўчы аналіз паўстання 1830–1831 гг. і паўстання 1863–1864 гг. на тэрыторыі Беларусі па наступным крытэрыям: прычыны паўстання, мэты, праграма яго кіраўнікоў, органы кіравання, сацыяльная база паўстання, ход баявых дзеянняў, вынікі паўстання.*

*3. Як насельніцтва беларускіх зямель адносілася да Напалеона і французкай арміі падчас вайны 1812 г.? Які характар мела гэта вайна на беларускіх землях? Абгрунтуйце свой адказ.*

*4. Чаму рэформы 60-х гг. XIX ст., якія праводзіліся ў Расійскай імперыі, называюцца буржуазнымі? У чым заключалася спецыфіка правядзення гэтых рэформаў на тэрыторыі Беларусі? Як у цэлым гэтыя рэформы паўплывалі на развіццё беларускіх губерняў?*

*5. Параўнайце эканамічнае развіццё беларускіх губерняў у першай палове XIX ст. і ў другой палове XIX ст. Якія змены ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы, гандлі, шляхах зносін у беларускіх губернях вы можаце назваць? З чым былі звязаны гэтыя змены?*

*6. Назавіце дзеячоў навукі, культуры, грамадска-палітычнага руху на беларускіх землях у XIX–пачатку XX ст., якія, на вашу думку, паўплывалі на фарміраванне беларускай ідэі і ў цэлым на фарміраванне беларускай нацыі. Як вы лічыце, чаму працэс фарміравання беларускай нацыі скончыўся дастаткова позна ў параўнанні, напрыклад, с іншымі ўсходнімі славянамі?*

*7. Раскажыце пра ход першай расійскай рэвалюцыі 1905–1907 гг. на тэрыторыі Беларусі і вызначце асноўныя палітычныя лагеры, якія склаліся ў расійскім, у тым ліку і беларускім, грамадстве напярэдадні і падчас гэтай рэвалюцыі. Што вы можаце сказаць пра сацыяльную базу, партыі і арганізацыі, якія ўваходзілі ў кожны з палітычных лагераў, а таксама пра асноўныя патрабаванні і мэты, якія яны ставілі перад сабой?*

*8. Вызначце мэты, характар і вынікі рэвалюцыі 1905–1907 гг. і Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. Якія змены адбыліся ў грамадска-палітычным жыцці Расійскай імперыі пасля гэтых падзей?*

*9. Што абазначала патрабаванне БСГ аб нацыянальна-тэрытарыяльнай аўтаноміі Беларусі і чаму Часовы ўрад адмовіўся весці перамовы з Беларускім нацыянальным камітэтам наконт аўтаноміі Беларусі?*

*10. Раскрыйце прычынна-выніковыя сувязі паміж наступнымі гістарычнымі з’явамі (фактамі):*

- *паўстанне 1830–1831 гг. → узмацненне «разбора» шляхты;*
- *уключэнне Беларусі ў агульнарасійскі рынак → паляпшэнне шляхоў зносін і развіццё гандлю;*
- *далучэнне ўніятаў да Рускай праваслаўнай царквы → узмацненне пазіцый самаўладдзя;*
- *паўстанне 1863–1864 гг. → скасаванне часоваабавязанага стану сялян у беларускіх губернях;*
- *сталыпінская аграрная рэформа → стварэнне ўмоў для развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы Беларусі па «амерыканскаму» шляху;*
- *Маніфест 17 кастрычніка 1905 г. → пачатак дэмакратызацыі грамадства.*

### *Тэмы рэфератаў*

1. Камітэт заходніх губерняў: асноўныя напрамкі дзейнасці (1831–1848 гг.).

2. Саслоўны і рэлігійны склад насельніцтва паводле перапісу 1897 г.

3. Беларускія старонкі дзекабрыстаў.

4. Адлюстраванне падзей вайны 1812 г. у творчасці беларускіх мастакоў першай паловы XIX ст.

5. В. Дунін-Марцінкевіч і С. Манюшка: творчае супрацоўніцтва класіка новай беларускай літаратуры і заснавальніка польскай класічнай музыкі.

6. М.М. Мураўёў і яго праграма мадэрнізацыі беларускіх земляў у складзе Расійскай імперыі.

7. Станаўленне і развіццё беларусазнаўства.

8. Класіцызм у архітэктуры Беларусі першай паловы XIX ст.

9. Эклектыка ў архітэктуры Беларусі другой паловы XIX ст.

10. Гісторыя Беларусі ў мастацкіх творах Н. Орды.

11. Станаўленне беларускага нацыянальнага тэатра.

12. Культурнае жыццё Мінска на пачатку XX ст.

13. «Наша Ніва» ў нацыянальным адраджэнні беларусаў (1906–1915 гг.).

14. Дэпутаты-беларусы ў I і II Дзяржаўных Думах.

15. Ідэалогія заходнерусізму і яе ўплыў на грамадска-палітычнае жыццё Беларусі.

### **Літаратура**

Абезгауз, З.Е. Развитие промышленности и формирование пролетариата Белоруссии во второй половине XIX века / З.Е. Абезгауз. – Минск: Наука и техника, 1971.

Болбас, М.Ф. Развитие промышленности в Белоруссии (1795–1861 гг.) / М.Ф. Болбас. – Минск : Наука и техника, 1966.

Болбас, М.Ф. Промышленность Белоруссии: 1860–1900 / М.Ф. Болбас. – Минск: Изд-во БГУ, 1978.

Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII–пачатку XXI ст.: у 2 кн. / А.А. Каваленя [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск: Беларуская навука, 2011. – Кн. 1.

Гісторыя сялянства Беларусі: Са старажытных часоў да 1996 г.: у 3 т. / Нац. акад. навук Бел., Ін-т гісторыі; гал. рэд. М.П. Касцюк (старш.) [і інш.]. – Мінск: Бел. навука, 1997–2002.

Жытко, А.П. Дваранства Беларусі перыяду капіталізму. 1861–1914 гг. / А.П. Жытко. – Мінск: БДПУ, 2003.

Забаўскі, М.М. Расійская Дзяржаўная Дума ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі (1906–1917 гг.) / М.М. Забаўскі. – Мінск: БДПУ, 1999.

История Беларуси в документах и материалах / авт.-сост.: И.Н. Кузнецов, В.Г. Мазец. – Минск: Амалфея, 2000.

Канфесіі на Беларусі (канец XVIII–XX ст.) / В.В. Грыгор'ева [і інш.]; навук. рэд. У.Л. Навіцкі. – Мінск : ВП «Экаперспектыва», 1998.

Лепеш, О.В. Комитет западных губерний: организация и деятельность (1831–1848 гг.) / О.В. Лепеш. – Минск: РИВШ, 2010.

Липинский, Л.П. Столыпинская аграрная реформа в Белоруссии / Л.П. Липинский. – Минск : Изд-во БГУ, 1978.

Лугаўцова, С.Л. Палітыка самадзяржаўя ў адносінах да дваранства Беларусі (1831–1856 гг.) / С.Л. Лугаўцова // Пытанні гісторыі Беларусі: зб. навук. арт. / Бел. дзярж. пед. ун-т імя Максима Танка; пад агул. рэд. А.М. Лютага. – Мінск: БДПУ, 1998.

Люты, А.М. Дваранства Беларусі ў перыяд разлажэння і крызісу феадалізму (канец XVIII–першая палова XIX ст.): вучэбна-метадычны дапаможнік / А.М. Люты, Г.М. Туміловіч; Бел. дзярж. пед. ун-т імя Максіма Танка. – Мінск: БДПУ, 1991.

Люты, А.М. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў другой палове XVIII–першай палове XIX ст. / А.М. Люты. – Мінск: БДПУ, 2004.

Марозава, С.В. Уніяцкая царква ў этнакультурным развіцці Беларусі (1596–1893) / С.В. Марозава. – Гродна: ГрДУ, 2001.

Полетаева, Н.И. Купечество Беларуси. 60-е гг. XIX–начало XX в. – Минск, 2004.

Самбук, С.М. Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX в. / С.М. Самбук. – Минск: Наука и техника, 1980.

Слобожанин, В.П. Земское управление в Белоруссии / В.П. Слобожанин. – Минск: Право и экономика, 1994.

Смяховіч, М. Арганізацыя і асобы: паўстанне 1830–1831 гг. на Беларусі / М. Смяховіч // Полымя. – 1996. – № 4.

Соркіна, І. Мястэчкі Беларусі ў канцы XVIII–першай палове XIX ст. / І. Соркіна. – Вільня, 2010.

Таляронак, С. Грамадска-палітычны рух на Беларусі напярэдадні вайны 1812 г. / С. Таляронак // Беларускі гістарычны часопіс. – 1994. – № 3.

Таляронак, С.В. Палітыка царызму ў адносінах да каталіцкай і ўніяцкай царквы на Беларусі (1772–1839 гг.) / С.В. Таляронак // Весці Акадэміі навук Беларусі. Сер. грамад. навук. – 1992. – № 2.

Терешкович, П.В. Этническая история Беларуси XIX–начала XX в. / П.В. Терешкович. – Минск, 2004.

Чепко, В.В. Города Белоруссии в первой половине XIX века (Экономическое развитие) / В.В. Чепко. – Минск : Изд-во БГУ, 1981.

Чепко, В.В. Сельское хозяйство Белоруссии в первой половине XIX века / В.В. Чепко. – Минск: Наука и техника, 1966.

Черепица, В.Н. Михаил Осипович Коялович. История жизни и творчества / В.Н. Черепица. – Гродно, 1998.

Шалькевич, В.Ф. Кастусь Калиновский: страницы биографии / В.Ф. Шалькевич. — Минск : Университетское, 1988.

Швед, В.В. Паміж Польшчай і Расіяй: грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772–1863 гг.) / В.В. Швед. – Гродна: ГрДУ, 2001.

Швед, В. Беларускія старонкі гісторыі дзекабрыстаў / В. Швед. – Мінск : БелНДІДАС, 1998.

Яноўская, В.В. Хрысціянская царква ў Беларусі ў 1863–1914 гг. / В.В. Яноўская. – Мінск, 2002.

# Модуль 3. БЕЛАРУСЬ У САВЕЦКІ ПЕРЫЯД. СТАНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ НЕЗАЛЕЖНАЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ (1917–2013 гг.)

## Тэма 7. БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў ПЕРЫЯД САЦЫЯЛЬНЫХ УЗРУШЭННЯЎ У ПАЧАТКУ XX ст. (частка 2)

**(1 гадзіна)**

Абвастрэнне палітычнага і сацыяльна-эканамічнага крызісу ў Расіі восенню 1917 г. Барацьба агульнарасійскіх і беларускіх партый за выбар шляхоў грамадскага развіцця. Бальшавізацыя саветаў. Перамога Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Петраградзе. Абвяшчэнне савецкай улады.

Рэвалюцыйныя падзеі на Беларусі і Заходнім фронце. Утварэнне і пачатак дзейнасці органаў савецкай улады Заходняй вобласці і фронту. Адносіны беларускіх нацыянальных арганізацый да Кастрычніцкай рэвалюцыі. Першы Усебеларускі з’езд (снежань 1917 г.) і яго рашэнні.

Ваенная інтэрвенцыя Германіі. Брэсцкі мірны дагавор і яго наступствы.

Спробы фарміравання беларускай дзяржаўнасці на нацыянальна-дэмакратычнай аснове. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР). Захады БНР у галіне дзяржаўнага будаўніцтва і культурна-асветніцкай сферы. Палітычны крызіс БНР.

Завяршэнне нямецкай акупацыі Беларусі. Шляхі фарміравання беларускай дзяржаўнасці на класава-рэвалюцыйнай аснове. Дзейнасць Беларускага нацыянальнага камісарыята і Беларускіх секцый РКП(б) па стварэнні Беларускай Савецкай рэспублікі. Пазіцыя бальшавікоў у беларускім пытанні. Абвяшчэнне ССРБ. Першы Усебеларускі з’езд Саветаў. Утварэнне Літоўска-Беларускай ССР (ЛітБел).

Савецка-польская вайна. Палітыка Ю. Пілсудскага ў адносінах да Беларусі. Барацьба супраць польскіх інтэрвентаў. Завяршэнне савецка-польскай вайны. Другое абвяшчэнне ССРБ. Рыжскі мірны дагавор у лёсе беларусаў. Беларускае пытанне пры афармленні Версальска-Вашынгтонскай сістэмы.

*План семінара № 6*

## ДЗЯРЖАЎНАСЦЬ БЕЛАРУСІ Ў ПАСЛЯКАСТРЫЧНІЦКІ ПЕРЫЯД (1917–1921 гг.).

**(2 гадзіны)**

**План**

1. Абвастрэнне сацыяльна-эканамічнага і палітычнага крызісу ў Расіі восенню 1917 г. Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г. і ўсталяванне савецкай улады ў Беларусі.
2. Праблема беларускай дзяржаўнасці ў грамадска-палітычным руху Беларусі. Першы Усебеларускі з'езд (снежань 1917 г.) і яго рашэнні.
3. Абвяшчэнне і дзейнасць Беларускай Народнай Рэспублікі ва ўмовах нямецкай акупацыі (сакавік–снежань 1918 г.).
4. Утварэнне ССРБ і Літоўска-Беларускай ССР.
5. Вайна Польшчы і Савецкай Расіі. Другое абвяшчэнне БССР. Рыжскі мір.

***Асноўныя паняцці, тэрміны, асобы:*** савецкая ўлада, дыктатура пралетарыяту, Першы Усебеларускі з'езд, ваенная інтэрвенцыя Германіі, Аблвыкамзах, СНК Заходняй вобласці і фронту, Беларуская Народная Рэспубліка, Брэсцкі мір, ССРБ, Літоўска-Беларуская ССР, савецка-польская вайна, Рыжскі мір, разруха, інфляцыя, беспрацоўе, бежанцы, лікбез.

У. Ленін, В. Ігнатоўскі, В. Кнорын, В. Ластоўскі, А. Мяснікоў, А. Луцкевіч, Ю. Пілсудскі, А. Чарвякоў, І. Варонка, Дз. Жылунович, В. Міцкявічус-Капсукас.

***Асноўныя падзеі***

25 кастрычніка 1917 г. – перамога ўзброенага паўстання ў Петраградзе.

Кастрычнік – лістапад 1917 г. – усталяванне савецкай улады на неакупіраванай тэрыторыі Беларусі.

26 лістапада 1917 г. – утварэнне абласнога выканаўчага камітэта Савета дэпутатаў Заходняй вобласці і фронту (Аблвыканкамзах) і Савета народных камісараў Заходняй вобласці.

15–17 снежня 1917 г. – I Усебеларускі з'езд (кангрэс) прадстаўнікоў беларускіх партый і арганізацый.

12 студзеня 1918 г. – пачатак мяцежа корпуса генерала Доўбар-Мусніцкага супраць савецкай улады.

31 студзеня 1918 г. – дэкрэт СНК РСФСР аб утварэнні Беларускага нацыянальнага камісарыяту (Белнацкама).

18 лютага 1918 г. – пачатак наступлення нямецкіх войск і акупацыі цэнтральнай і ўсходняй Беларусі.

20–21 лютага 1918 г. – утварэнне ў Мінску (ад імя Рады Усебеларускага з'езда) Народнага сакратарыяту Беларусі – першага урада Беларусі пасля распаду Расійскай імперыі, прыняцце Першай устаўнай граматы.

3 сакавіка 1918 г. – заключэнне Брэсцкага міру з Германіяй.

9 сакавіка 1918 г. – абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР).

18 сакавіка 1918 г. – перайменаванне Рады Усебеларускага з'езда ў Раду БНР.

25 сакавіка 1918 г. – абвяшчэнне незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР).

Лістапад–снежань 1918 г. – вызваленне Беларусі ад нямецкіх захопнікаў.

1 студзеня 1919 г. – абвяшчэнне Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусія (ССРБ). Утварэнне Часовага працоўна-сялянскага ўрада Беларусі на чале з Дз. Жылуновічам.

2–3 лютага 1919 г. – I Усебеларускі з'езд саветаў. Прыняцце першай Канстытуцыі ССРБ. Выбары ЦВК Літоўска-Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі (ЛітБелССР).

27 лютага 1919 г. – першае аб'яднанае паседжанне ЦВК ЛітБелССР і ЦВК ССРБ.

Сакавік 1919 г. – кастрычнік 1920 г. – польска-савецкая вайна.

31 ліпеня 1920 г. – прыняцце «Дэкларацыі аб абвяшчэнні незалежнасці Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі».

Лістапад – снежань 1920 г. – Слуцкае паўстанне.

18 сакавіка 1921 г. – падпісанне ў Рызе мірнага дагавору паміж Савецкай Расіяй і Польшчай.

### *Пытанні для абмеркавання і разважання*

*1. Назавіце асноўныя прычыны Кастрычніцкай рэвалюцыі. Ці была яна непазбежнай?*

*2. Ці можна лічыць Беларускую Народную Рэспубліку сапраўднай дзяржавай? Якія пралікі дапусціла кіраўніцтва беларускіх нацыянальна-дэмакратычных колаў?*

### Тэмы рэфератаў

1. Брэсцкі мір і лёс Беларусі.
2. Знешнепалітычныя арыентацыі Рады БНР.
3. Палітычныя партрэты: А. Луцкевіч, Я. Варонка, В. Ластоўскі, Дз. Жылуновіч, А.Чарвякоў, А. Мяснікоў і інш.
4. Палітыка Ю. Пілсудскага ў адносінах да Беларусі.

### Літаратура

Беляев, А.В. История Беларуси 1917–1985 гг. (советский период): конспект лекций / А.В. Беляев, А.А. Киселёв. – Минск: Изд-во УО «Военная академия Республики Беларусь», 2009.

Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва, 2000–2008. – Т. 5: Беларусь у 1917–1945 гг. / рэд. М. Касцюк. – Мінск: Экоперспектива, 2007.

Государственность Беларуси: Проблемы формирования в программах политических партий / В.К. Коршук [и др.]. – Минск: БГУ, 1999.

Круталевич, В. История Беларуси: становление национальной государственности / В. Круталевич. – Минск: Журн. «Право и экономика», 1999.

Круталевич, В.А. На путях национального самоопределения / В.А. Круталевич. – Минск: Право и экономика, 1995.

Круталевіч, В.А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі (1917–1945 гг.) / В.А. Круталевіч, І.А. Юхо. – Мінск: Беларуская навука, 2000.

Ладысеў, У.Ф. На пераломе эпох: станаўленне беларускай дзяржаўнасці (1917–1920 гг.) / У.Ф. Ладысеў, П.І. Брыгадзін. – Мінск: БДУ, 1999.

Рудовіч, С. Час выбару: праблема самавызначэння Беларусі ў 1917 годзе / С. Рудовіч. – Мінск: Тэхналогія, 2001.

Сідарэвіч, А.М. Беларуская Народная Рэспубліка / А.М. Сідарэвіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 1993–2003. – Т. 1. – Мінск: БелЭн, 1993. – С.384–390.

Усебеларускі з’езд 1917 года: сведчанне сучасніка / публікацыя В. Скалабана // Беларускі гістарычны часопіс. – 1993. – № 1.

Інтэграцыйныя працэсы ў гісторыі краін Усходняй Еўропы: матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 19–20 лістапада 2008 г. / НАН Беларусі, Інстытут гісторыі; рэдкал.: А.А. Каваленя [і інш.]. – Мінск, 2008.

Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII–пачатку XXI ст.: у 2 кн. / А.А. Каваленя [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі; Ін-т гісторыі. – Мінск: Беларуская навука, 2011.

# Тэма 8. ГЕАПАЛІТЫЧНАЕ СТАНОВІШЧА БЕЛАРУСІ Ў 1921–1939 гг.

**(2 гадзіны)**

Асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і культурнага развіцця Еўропы ў міжваенны перыяд. Цяжкасці пасляваеннага аднаўлення.

Асаблівасці пераходу БССР да мірнага жыцця. Крызіс палітыкі ваеннага камунізму.

Аб'яднанне савецкіх рэспублік у адзіным дзяржаўным саюзе. Удзел БССР ва ўтварэнні СССР.

Шляхі і метады будаўніцтва індустрыяльнага грамадства ў СССР. Савецкая Беларусь ва ўмовах нэпа. Аднаўленне прамысловасці. Сельская гаспадарка. Развіццё кааперацыі. Вынікі аднаўлення гаспадаркі рэспублікі і перспектывы развіцця.

Устанаўленне савецкай грамадска-палітычнай сістэмы ў БССР і яе асноўныя характарыстыкі. Праявы адміністрацыйна-бюракратычнай і нацыянальна-дэмакратычнай тэндэнцый. Вяртанне ўсходніх тэрыторый рэспублікі. Усталяванне аднапартыйнасці. Канстытуцыйнае афармленне савецкай палітычнай сістэмы ў БССР.

Спроба нацыянальна-культурнага адраджэння. Палітыка беларусізацыі: мэты, асноўныя накірункі, ажыццяўленне і вынікі.

Згортванне нэпа і усталяванне сістэмы дзяржаўнага сацыялізму ў СССР і БССР. Пераход да карэнных сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў. Ажыццяўленне індустрыялізацыі ў БССР: характар, дасягненні, выдаткі. Асаблівасці калектывізацыі ў БССР, яе вынікі.

Згортванне беларусізацыі. Сканцэнтраванне функцый заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады ў руках дзяржаўна-палітычнага апарата. Палітычныя рэпрэсіі ў БССР, іх трагічныя наступствы.

Агульныя вынікі сацыяльна-эканамічных і палітычных пераўтварэнняў 20–30-х гг. XX ст. у СССР і БССР.

Рыжскі мір у гістарычным лёсе беларускага народа. Заходняя Беларусь у складзе Польшчы. Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае становішча беларускіх зямель у складзе Польскай дзяржавы. Стан і характар прамысловага развіцця Заходняй Беларусі. Аграрнае пытанне. Становішча сялян.

Нацыянальны прыгнёт і палітычнае бяспраўе працоўных Заходняй Беларусі. Санацыйны рэжым.

Сацыяльны і нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі. Дзейнасць беларускіх палітычных партый і арганізацый (КПЗБ, БСРГ, ТБШ і і нш.). Культурныя дасягненні Заходняй Беларусі.

*План семінара № 7*

## САВЕЦКАЯ МАДЭЛЬ МАДЭРНІЗАЦЫІ БССР НА ЭТАПЕ СТАНАЎЛЕННЯ ІНДУСТРЫЯЛЬНАГА ГРАМАДСТВА (1920–1930-я гг.) (2 гадзіны)

### План

1. Удзел БССР у стварэнні СССР. Павелічэнне тэрыторыі рэспублікі.

2. Новая эканамічная палітыка, яе сутнасць і значэнне. Асаблівасці правядзення нэпа ў БССР.

3. Беларусізацыя як аснова нацыянальна-дзяржаўнай палітыкі БССР у 1920-я гг. Яе галоўныя напрамкі, метады ажыццяўлення і вынікі. Культурнае развіццё БССР у 1920–1930-я гг.

3. Адметнасці індустрыялізацыі і калектывізацыі ў БССР.

4. Савецкае грамадства ў канцы 1920–30-я гг. Усталяванне рэжыму дзяржаўнага сацыялізму ў БССР.

***Галовы ўрада Беларускай Народнай Рэспублікі:*** Я. Варонка, Р. Скірмунт, І. Серада, А. І. Луцкевіч, В. Ластоўскі.

***Кіраўнікі савецкай дзяржавы, першыя сакратары ЦК КП(б)Б:*** Мяснікоў (Мяснікян) А. (1918–1919), Міцкявічус-Капсукас В. (1919–1920), Кнорын В. (1920–1922, 1927–1928), Багуцкі В. (1922–1924), Асаткін-Уладзімірскі А. (1924), Крыніцкі А. (1924–1927), Гамарнік Я. (1928–1929), Гей К. (1930–1932), Гікала М. (1932–1937), Шаранговіч В. (1937), Волкаў А. (1937–1938), Панамарэнка П. (1938–1947).

***Палітычныя тэрміны:*** ваенны камунізм, Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, індустрыялізацыя, калектывізацыя, Канстытуцыя БССР, аднапартыйнасць, беларусізацыя, нэп, дзяржаўны сацыялізм, палітычныя рэпрэсіі, Заходняя Беларусь.

***Культурныя тэрміны:*** Інстытут беларускай культуры, Дзяржаўны музей, Цэнтральны архіў, выдавецтва «Советская Белоруссия», Рэспубліканская бібліятэка, беларусізацыя, карэнізацыя, Рэспубліканская надзвычайная камісія па ліквідацыі непісьменнасці, Беларускі Дзяржаўны ўніверсітэт, Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія, Беларускі політэхнічны інстытут, Магілёўскі настаўніцкі інстытут, Віцебскі настаўніцкі інстытут, Гомельскі настаўніцкі інстытут, Беларуская акадэмія навук, Цэнтральны батанічны сад, беларускі раман, канструктывізм і функцыяналізм, БДТ-1, БДТ-2, БДТ-3, Тэатр юнага гледача, Дзяржаўны тэатр лялек, «Кінорэсбел».

### ***Дзеячы культуры***

Б.А. Тарашкевіч, Я.Ф. Карскі, Я.Ю. Лёсік, У.М. Ігнатоўскі, А.Р. Жэбрак, У.В. Ластоўскі, У.Н. Перцаў, М.В. Доўнар-Запольскі, Янка Купала, Якуб Колас, Цішка Гартны, М. Лынькоў, Максім Танк, Змітрок Бядуля, У. Кароль, М. Шагал, К. Малевіч, Я. Драздовіч, В. Волкаў, Е. Міровіч, В. Галубок, С. Станюта, М. Чуркін, М. Аладаў, А. Багатыроу, Ю. Тарыч.

### ***Асноўныя падзеі***

18 сакавіка 1921 г. – падпісанне ў Рызе мірнага дагавору паміж Савецкай Расіяй і Польшчай (аб падзеле тэрыторыі суверэнай БССР без удзелу прадстаўнікоў апошняй).

21 сакавіка 1921 г. – дэкрэт аб замене харчовай развёрсткі харчовымі падаткамі. Пачатак новай эканамічнай палітыкі.

30 кастрычніка 1921 г. – утварэнне Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў Мінску.

14–18 снежня 1922 г. – IV Усебеларускі з'езд саветаў. Рашэнне аб добраахвотным уваходжанні БССР у склад Саюзу ССР.

30 снежня 1922 г. – I Усесаюзны з'езд саветаў. Прыняцце Дэкларацыі і Дагавору аб утварэнні Саюзу ССР.

Кастрычнік 1923 г. – I канферэнцыя камуністычных арганізацый Заходняй Беларусі. Утварэнне КПЗБ.

7 сакавіка 1924 г. – першае ўзбуйненне БССР.

15 ліпеня 1924 г. – Пастанова II сесіі ЦВК БССР аб правядзенні палітыкі беларусізацыі (развіццё беларускай самасвядомасці).

Ліпень 1925 г.–сакавік 1927 г. – дзейнасць у Заходняй Беларусі Беларускай сялянска-працоўнай грамады (БСПГ).

8 снежня 1926 г. – другое ўзбуйненне БССР.

5–12 красавіка 1927 г. – VIII з'езд Саветаў БССР. Прыняцце новай Канстытуцыі БССР.

1 студзеня 1929 г. – утварэнне Акадэміі навук Беларускай ССР.

2 жніўня 1932 г. – Пастанова СНК БССР «Аб увядзенні на Беларусі ўсеагульнай абавязковай адукацыі для малапісьменных».

1936–1938 гг. – хваля масавых арыштаў і рэпрэсій. Пачатак другой хвалі русіфікацыі.

19 лютага 1937 г. – прыняцце трэцяй Канстытуцыі БССР.

17 верасня 1939 г. – пераход Чырвонай Арміяй савецка-польскай мяжы. Далучэнне Заходняй Беларусі да БССР.

Кастрычнік 1939 г. – адлучэнне ад тэрыторыі Беларусі старажытнай сталіцы дзяржавы – горада Вільна з прылеглымі землямі (населенымі больш за 50 працэнтаў беларусамі) на карысць Літвы.

28–30 кастрычніка 1939 г. – Народны (Нацыянальны) сход Заходней Беларусі ў Беластоку, на якім прынята дэкларацыя аб абвяшчэнні савецкай улады.

2 лістапада 1939 г. – прыняцце Пазачарговай V сесіяй Вярхоўнага Савета СССР Закона аб уключэнні Заходняй Беларусі ў склад СССР і аб аб'яднанні яе з Беларускай ССР.

## Пытанні для абмеркавання і разважання

*1. Асаблівасці правядзення новай эканамічнай палітыкі ў Беларусі.*

*2. Масавыя рэпрэсіі: іх месца і роля ў жыцці насельніцтва Беларусі.*

## Тэмы рэфератаў

1. Знешняя палітыка СССР у 1920-я–1930-я гг.
2. Унутрыпартыйная барацьба ў СССР у 1920-я гг.
3. Палітычныя рэпрэсіі 1920–30-х гадоў на Беларусі і лёс беларускай інтэлігенцыі.

## Літаратура

Адамушка, У. Палітычныя рэпрэсіі 20–50-х гадоў на Беларусі / У. Адамушка. – Мінск: Беларусь, 1994.

Беларусізацыя, 1920-я гады: дакументы і матэрыялы / пад агул. рэд. Р.П. Платонова і У.К. Коршука. – Мінск: БДУ, 2001.

Беляев, А.В. История Беларуси 1917–1985 гг. (советский период): конспект лекций / А.В. Беляев, А.А. Киселёв. – Минск: Изд-во УО «Военная академия Республики Беларусь», 2009.

Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва, 2000–2008. – Т.5: Беларусь у 1917–1945 гг. / рэд. М. Касцюк. – Мінск: Экаперспектыва, 2007.

Касцюк, М. Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі / М. Касцюк. – Мінск: ВП «Экаперспектыва», 2000.

Котов, А.И. История земельных отношений в Беларуси: С древнейших времен до наших дней: учебное пособие / А.И. Котов. – Минск: Ураджай, 2001.

Круталевіч, В.А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі (1917–1945 гг.) / В.А. Круталевіч, І.А. Юхо. – Мінск: Беларуская навука, 2000.

Ладысеў, У.Ф. На пераломе эпох: станаўленне беларускай дзяржаўнасці (1917–1920 гг.) / У.Ф. Ладысеў, П.І. Брыгадзін. – Мінск: БДУ, 1999.

Платонаў, Р.П. На крутым павароце: Ідэолага-палітычная барацьба на Беларусі ў 1929–1931 гг. Дакументы, матэрыялы, аналіз / Р.П. Платонаў. – Мінск: БелНДІДАС, 1999.

Сарокін, А.М. На ростанях айчыннай гісторыі. Беларуская вёска: ад Дэкрэта да Кодэкса аб зямлі (1917–1990-я гады) / А.М. Сарокін. – Мінск: Дадатак да часопіса «Права і эканоміка», 1999.

Шымуковіч, С.Ф. Эканамічная гісторыя Беларусі: курс лекцый / С.Ф. Шымуковіч. – Мінск: Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэсп. Беларусь, 2003.

## Тэма 9. СССР І БССР У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XX–XXI ст. СТАНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ СУВЕРЭННАЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ (1990–2014 гг.)

**(2 гадзіны)**

Пасляваеннае пераўладкаванне свету. Складванне новай сістэмы міжнародных зносін. Уплыў СССР на характар грамадска-палітычных пераўтварэнняў у краінах Цэтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы. Арганізацыя сацыялістычнага лагера. Халодная вайна. Стварэнне ваенна-палітычных блокаў.

Удзел БССР у заснаванні і дзейнасці ААН. Роля і месца БССР на міжнароднай арэне ва ўмовах супрацьстаяння дзвюх грамадска-палітычных сістэм.

Асаблівасці грамадска-палітычнай сітуацыі ў БССР у пасляваеннае дзесяцігоддзе. Аднаўленне народнай гаспадаркі БССР пасля вайны. Стварэнне і развіццё новых галін прамысловасці (машынабудавання, металаапрацоўкі, хімічнай, нафтахімічнай). Ператварэнне БССР у індустрыяльна развітую краіну. Супярэчлівае развіццё сельскай гаспадаркі.

Асуджэнне культу асобы Сталіна. Спробы дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця ў другой палове 1950-х–першай палове 1960-х гг. Спробы кіраўніцтва СССР мадэрнізаваць народную гаспадарку сацыяльна-эканамічнымі рэформамі 1950-х−першай паловы 1960-х гг. Экстэнсіўны характар гаспадаркі. Асаблівасці выкарыстання дасягненняў навукова-тэхнічнай рэвалюцыі ў БССР. Урбанізацыя і яе вынікі.

Савецкая грамадска-палітычная сістэма ў другой палове 1960-х–першай палове 1980-х гг. Канстытуцыйнае замацаванне кіруючай ролі Камуністычнай партыі ў грамадстве. Развіццё сельскай гаспадаркі і прамысловасці БССР у другой палове 1960-х − першай палове 1980-х гг. Уплыў аварыі на Чарнобыльскай АЭС і іншых экалагічных праблем на развіццё гаспадаркі. Прычыны замаруджвання тэмпаў росту народнай гаспадаркі ў першай палове 1980-х гг. Узнікненне цяжкасцей у сацыяльнай сферы.

Курс на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага жыцця ў СССР. Палітыка перабудовы. Прынцыповыя змены ў знешняй палітыцы Савецкага Саюза. Завяршэнне халоднай вайны. Прызнанне

прыярытэту агульначалавечых каштоўнасцей пры вырашэнні глабальных і рэгіянальных праблем. Новыя суадносіны сіл на міжнароднай арэне.

Спробы мадэрнізацыі савецкай грамадска-палітычнай і эканамічнай сістэмы. Змены ў духоўным жыцці беларускага грамадства ў другой палове 1980-х гг.

Нарастанне крызісу савецкай сістэмы. Распад СССР і новыя суадносіны сіл на сусветнай арэне. Абвяшчэнне суверэнітэту савецкіх рэспублік. Прыняцце Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР 27 ліпеня 1990 г. Утварэнне Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Абвяшчэнне Рэспублікі Беларусь. Заканадаўча-прававое афармленне дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь. Прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 15 сакавіка 1994 г. Выбары Першага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Асноўныя тэндэнцыі грамадска-палітычнага развіцця Рэспублікі Беларусь. Вынікі рэспубліканскіх рэферэндумаў 1995, 1996, 2004 гг. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь са змяненнямі і дапаўненнямі, прынятымі на рэспубліканскім рэферэндуме 1996 г. Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2001, 2006, 2010 гг.). Складванне шматпартыйнасці. Фарміраванне ідэалогіі беларускай дзяржавы.

Асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь. Пошук шляхоў пераходу да рыначнай эканомікі. Распрацоўка нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага эканамічнага развіцця краіны. Галоўныя мэты і асноўныя элементы беларускай мадэлі сацыяльна арыентаванай эканомікі, сродкі яе рэалізацыі і дасягненні. Роля ўсебеларускіх народных сходаў у прыняцці планаў сацыяльна-эканамічнага развіцця рэспублікі.

Геапалітычнае становішча Рэспублікі Беларусь. Роля Беларусі ў стварэнні і станаўленні СНД. Працэс стварэння Саюза Беларусі і Расіі. Месца Рэспублікі Беларусь у інтэграцыйных працэсах на постсавецкай і еўразійскай прасторы. Асноўныя тэндэнцыі знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь ва ўмовах глабалізацыі. Рэспубліка Беларусь – раўнапраўны член сусветнай супольнасці.

### *План семінара № 8*

## САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ: ДАСЯГНЕННІ І ПРАБЛЕМЫ СТВАРАЛЬНАЙ ПРАЦЫ НАРОДА (1945–1991 гг.). СУЧАСНАЯ РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ ВА ЎМОВАХ ГЛАБАЛІЗАЦЫІ СУСВЕТНЫХ ПРАЦЭСАЎ

**(2 гадзіны)**

### План

1. БССР у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе. Асаблівасці працэсу аднаўлення народнай гаспадаркі.
2. Грамадска-палітычнае жыццё БССР ва ўмовах хрушчоўскай «адлігі». Спробы рэфармавання эканомікі ў 1950–60-х гг.
3. Сацыяльна-эканамічнае развіццё БССР у 1970–80-х гг. Асаблівасці духоўнага і грамадскага жыцця рэспублікі ў гады застоя.
4. Распад СССР і прававое афармленне дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь.
5. Асноўныя тэндэнцыі грамадска-палітычнага развіцця Рэспублікі Беларусь у 1990-х гг.–пачатку XXI ст. Геапалітычнае становішча Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе.
6. Пошук, станаўленне і рэалізацыя беларускай мадэлі сацыяльна-арыентаванай рынкавай эканомікі (1990-е–2014 г.). Дзяржаўныя праграмы развіцця Рэспублікі Беларусь.

### *Кіраўнікі дзяржавы*

***старшыні Савета Народных Камісараў:*** К. В. Кісялёў (28.07.1938–28.06.1940), І. С. Былінскі (28.06.1940–07.02.1944), П. К. Панамарэнка (07.02.1944–15.03.1946).

***старшыні Савета Міністраў Беларускай ССР:*** П. К. Панамарэнка (15.03.1946–15.03.1948), А. Я. Кляшчоў (15.03.1948–25.06.1953), К. Т. Мазураў (25.06.1953–28.07.1956), М. Я. Аўхімовіч (28.07.1956–09.04.1959), Ц Я. Кіселёў (09.04.1959–11.12.1978), А. Н. Аксёнаў (11.12.1978–08.07.1983), У. І. Бровікаў (08.07.1983–10.01.1986), М. В. Кавалёў (10.01.1986–07.04.1990), В. Ф. Кебіч (07.04.1990–18.09.1991).

***Прэм’ер-міністры (старшыні) Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь:*** В. Ф. Кебіч (18.09.1991–21.07.1994), М. М. Чыгір (21.07.1994–18.11.1996), С. С. Лінг (18.11.1996–18.02.2000) (в. а. да 19.02.1997), У. В. Ярмошын (18.02.2000–01.10.2001) (в. а. да 14.03.2000), Г. В. Навіцкі (01.10.2001–10.07.2003) (в. а. да 10.10.2001), С. С. Сідорскі (10.07.2003–27.12.2010) (в. а. да 19.12.2003), М. У. Мясніковіч (28.12.2010–цяп. час).

***Іншыя палітычныя дзеячы:*** М.С. Патолічаў, М.Н. Слюнькоў, Я.Я. Сакалоў, А.А. Малафееў, С.С. Шушкевіч, З.С. Пазняк, С.Г. Шарэцкі, М.І. Грыб.

***Тэрміны, звязаныя з культурай:*** адукацыйная рэформа, Мінскі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут, Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут замежных моў, Беларускі інстытут механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі, Мінскі радыётэхнічны інстытут, Мінскі інстытут культуры, Гомельскі політэхнічны інстытут, ваенная тэма ў беларускай літаратуры, інтэрнацыянальны стыль у горадабудаўніцтве, манументальнае пластычнае мастацтва, руская і беларуская мовы ў Беларусі, свабода веравызнання, ліцэі, гімназіі, каледжы, акадэміі, бакалаўрыат, магістратура, 11-годка ў сярэдняй школе, 10-бальная сістэма ацэнкі ведаў, міжнародныя адукацыйныя стандарты ў вышэйшай адукацыі.

***Дзеячы культуры:*** І. Шамякін, Н. Гілевіч, В. Быкаў, А. Макаёнак, У. Караткевіч, Р. Барадулін, Г. Бураўкін, А. Адамовіч, І. Навуменка, А. Дудараў, М. Савіцкі, З. Азгур, А. Грубэ, А. Бембель, Г. Заборскі, Б. Луцэнка, М. Чуркін, А. Багатыроў, В. Елізар’еў, Ю. Семеняка, С. Смольскі, С. Картэс, М. Аладаў, Я. Глебаў, Г. Вагнер, Л. Александроўская, У. Дашук, С. Алексіевіч, І. Пташнікаў, І. Чыгрынаў, М. Фінберг, І. Лучанок, Э. Зарыцкі, Л. Захлеўны, М. Пташук.

***Палітычныя і сацыяльна-эканамічныя тэрміны:*** сацыялістычны лагер, халодная вайна, культ асобы, дэмакратызацыя грамадска-палітычнага жыцця, Канстытуцыя БССР, Чарнобыльская АЭС, палітыка перабудовы, распад СССР, Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР, Садружнасць Незалежных Дзяржаў, Рэспубліка Беларусь, Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў і

Савет Рэспублікі, Канстытуцыйны суд, Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, шматпартыйнасць, рэферэндумы, сацыяльна арыентаваная эканоміка, Усебеларускі сход, Саюз Беларусі і Расіі, інтэграцыя.

### *Асноўныя падзеі*

Чэрвень 1945 г. – дэлегацыяй БССР падпісаны Статут ААН. Беларусь уваходзіць у лік краін-заснавальніц ААН.

11 верасня 1946 г. – закон «Аб пяцігадовым плане аднаўлення і развіцці народнай гаспадаркі Беларускай ССР на 1946–1950 гг.».

Снежань 1947 г. – адмена карткавай сістэмы, грашовая рэформа ў СССР.

26 чэрвеня 1974 г. – прысваенне Мінску ганаровага звання «Горад-герой».

14 красавіка 1978 г. – прыняцце чацвёртай Канстытуцыі Беларускай ССР.

26 красавіка 1986 г. – аварыя на Чарнобыльскай АЭС. Трагічныя наступствы для насельніцтва сучаснай Беларусі.

24–25 чэрвеня 1989 г. – устаноўчы з'езд Беларускага народнага фронту «Адраджэнне».

26 студзеня 1990 г. – закон аб мовах у Беларускай ССР, у адпаведнасці з якім беларуская мова юрыдычна абвешчана дзяржаўнай.

27 ліпеня 1990 г. – Вярхоўны Савет БССР абвясціў Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай ССР.

25 жніўня 1991 г. – Вярхоўны Савет БССР надаў Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР статус канстытуцыйнага закону; прыпынена дзейнасць КПБ.

8 снежня 1991 г. – «Белавежскае» пагадненне аб прыпыненні дзейнасці органаў СССР на тэрыторыі Беларусі, РСФСР і Украіны і ўтварэнне Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД).

15 сакавіка 1994 г. – прынята Канстытуцыя (Асноўны Закон) Рэспублікі Беларусь,

10 ліпеня 1994 г. – выбранне першага прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

14 мая 1995 г. – парламентскія выбары і рэферэндум па пытаннях надання рускай мове роўнага статуса з беларускай, усталяванне новых Дзяржаўнага сцяга і Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь.

24 ліпеня 1996 г. – унясенне змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь і прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь на рэферэндуме. Рэформа дзяржаўных органаў Рэспублікі Беларусь.

2 красавіка 1997 г. – падпісанне дагавору паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй «Аб стварэнні Саюзу Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі».

15 кастрычніка 2000 г. – правядзенне першых выбараў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

9 верасня 2001 г. – правядзенне першых выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь пасля ўнясення змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь.

2 ліпеня 2002 г. – зацверджаны новыя словы да Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь.

17 кастрычніка 2004 г. – на рэспубліканскім рэферэндуме ўнесены змяненні ў Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь. Адна асоба мае права займаць пасаду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь без абмежавання колькасці разоў.

## Тэмы рэфератаў

1. Удзел БССР у заснаванні і дзейнасці ААН.
2. П.М. Машэраў – першы сакратар ЦК КПБ (1965–1980 гг.).
3. Канстытуцыя БССР 1978 г.
4. Гаспадарчая рэформа 1965 г.: дасягненні і недахопы.
5. М.С. Хрушчоў: палітычны партрэт.
6. Развіццё культуры Беларусі ў другой палове 1940-х–1980-я гг.
7. Культура Беларусі на сучасным этапе.
8. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 г. і Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1996 г. са змяненнямі і дапаўненнямі, прынятымі на рэспубліканскім рэферэндуме: параўнальны аналіз.
9. Грамадскія арганізацыі і палітычныя партыі Беларусі на сучасным этапе.
10. Рэспубліканскія рэферэндумы 1995, 1996, 2004 гг. і іх вынікі.
11. Асновы дзяржаўнага ладу суверэннай Рэспублікі Беларусь.

# Літаратура


Антонович, С.В. Пётр Машеров: Жизнь, судьба, память… / С.В. Антонович. − Минск: Юнацтва, 1998.

Беляев, А.В. История Беларуси 1917–1985 гг. (Советский период): конспект лекций / А.В. Беляев, А.А. Киселёв. – Минск: Изд-во УО «Военная академия Республики Беларусь», 2009.

Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва, 2000-2008. – Т. 6: Беларусь у 1945–2009 г. – 2011. – 351 с.

Беларусь на мяжы тысячагоддзяў / рэдкал.: А.П. Вайтовіч [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 2000.

Дробов, Л.Н. Живопись Советской Белоруссии (1917–1975 гг.) / Л.Н. Дробов. – Минск: Вышэйшая школа, 1979.

Касцюк, М.П. Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі / М.П. Касцюк. − Мінск: ВП «Экаперспектыва», 2000.

Круталевич, В.А. На путях национального самоопределения: БНР−БССР−Рэспубліка Беларусь / В.А. Круталевич. – Минск, 1995.

Лыч, Л. Гісторыя культуры Беларусі / Л. Лыч, У. Навіцкі. – Мінск: НКФ «Экаперспектыва», 1996.

Новік, Я.К. Беларусь у перыяд правядзення рэформ: Сучасная праблема сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і культурнага развіцця (1985–1995 гг.) / Я.К. Новік, Л.Ю. Жданко. − Мінск, 1995.

Очерки истории науки и культуры Беларуси. IX–XX вв. / П.Т.Петриков [и др.]. – Минск: Навука і тэхніка, 1996.

Парфянкоў, У.Я. Беларусь у міжнародным супольніцтве (1945–1995 гг.) / У.Я. Парфянкоў. − Мінск: БДУІР, 1995.

Снапковский, В.Е. Белорусская ССР в ООН (1945–1985 гг.) / В.Е. Снапковский. − Минск: Наука и техника, 1985.

Сарокін, А.М. На ростанях айчыннай гісторыі. Беларуская вёска: ад Дэкрэта да Кодэкса аб зямлі (1917–1990-я гг.) / А.М. Сарокін. – Мінск: Дадатак да часопіса «Права і эканоміка», 1999.

Спапкоўскі, У.Е. Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі: вучэбны дапаможнік: у 2 ч. / У.Е. Спапкоўскі. – Мінск: БДУ, 2004.

Беларусь на мяжы тысячагоддзяў / рэдкал.: А.П. Вайтовіч [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 2000.

Аб дзяржаўным суверынітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі: Дэкларацыя Вярхоўнага Савета БССР ад 27 ліпеня 1990 г. – Мінск, 1990.

История политических партий: материалы для самостоятельной работы студентов / под ред. В.К. Коршука, И.Ф. Романовского. – Минск: БГУ, 2002.

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь. – Мінск: Беларусь, 2007.

Мельник, В.А. Государственная идеология Республика Беларусь: Концептуальные основы / В.А. Мельник. – Минск: Тесей, 2003.

Міpановіч Я. Найноўшая гісторыя Беларусі. – СПб., 2003.

Никитенко, П.Г. Модель устойчивого социально-экономического развития Беларуси: проблемы формирования и эволюции / П.Г. Никитенко. – Минск: Право и экономика, 2000.

Основные направления социально-политического развития Республики Беларусь на 1996–2000 гг. – Минск: ООО «Мисанта», 1998.

Программа социально-экономического развития Республики Беларусь на 2001–2005 гг. – Минск: Беларусь, 2001.

Программа социально-экономического развития Республики Беларусь на 2006–2010 гг. – Минск: Беларусь, 2006.

Суверенитет и многовекторность внешней политики Республики Беларусь в современных условиях. – Минск: ИСПИ, 2000.

Літаратура / Л.М. Гарэлік [і інш.] // Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. – Мінск: БелЭн, 2000. – С. 305–320.

Корзенко, Г.В. Подготовка научных кадров в Беларуси. Взгляд сквозь годы / Г.В. Корзенко. – Минск: Бел. изд. тов-во «Хата», 1998.

Красінскі, А.В. Кіно / А.В. Красінскі // Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. – Мінск: БелЭн, 2000. – С. 365–374.

Культурология: теория и история культуры / под общ. ред. И.Е. Ширшова. – Минск: БГЭУ, 2004.

Лакотка А.І. Дойлідства // Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. – Мінск: БелЭн, 2000. – С. 374–395.

Лыч, Л. Гісторыя культуры Беларусі / Л. Лыч, У. Навіцкі. – Мінск: НКФ «Экаперспектыва», 1996.

Смольскі, Р.Б. Тэатральнае мастацтва / Р.Б. Смольскі // Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. – Мінск: БелЭн, 2000. – С. 350–364.

Юўчанка, К.А. Музычнае мастацтва / К.А. Юўчанка // Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. – Мінск: БелЭн, 2000. – С. 338–349.

## ПРАВІЛЫ НАПІСАННЯ І АФАРМЛЕННЯ РЭФЕРАТАЎ

Рэферат з'яўляецца адной з важных формаў самастойнай работы студэнта і паказвае ўменне студэнта працаваць з літаратурай і іншымі крыніцамі інфармацыі, самастойна знаходзіць неабходныя дадзеныя, рабіць іх аналіз і фармуляваць вывады. У час пошуку дадатковай інфармацыі значна пашыраецца і дапаўняецца кола атрыманых на лекцыйных і семінарскіх занятках ведаў студэнта. Праца над рэфератамі з'яўляецца падрыхтоўкай навучэнца да выканання курсавых і дыпломных праектаў. Таксама пры напісанні рэфератаў з'яўляецца магчымасць вызначыць схільнасць студэнтаў да навуковых даследаванняў.

Рэфераты выконваюцца да канкрэтных семінарскіх заняткаў па вызначаных выкладчыкам тэмах. У час правядзення семінара студэнту неабходна выступіць са сваім рэфератам перад групай, пасля выступлення павінна адбыцца кароткае абмеркаванне зробленай працы.

Рэфераты выконваюцца ў друкаваным ці рукапісным выглядзе ў адпаведнасці з наступнымі структурай і правіламі афармлення.

1. **Тытульны ліст** (прыклад глядзі далей).

2. **Уводзіны** (кароткая частка на адну–дзве старонкі, дзе павінны быць вызначаны тэма рэферата, яго асноўны змест і пытанні, якія разглядаюцца ў рабоце, таксама абавязкова студэнт павінен правесці кароткі аналіз выкарыстаных крыніц).

3. **Асноўная частка рэферата** (непасрэдна сама работа). У друкаваным варыянце трэба выкарыстоўваць камп'ютарны шрыфт Times New Roman, размер 14, міжрадковы інтэрвал адзінарны, палі – 1,5 см злева, справа, зверху і знізу. Для першага радка абзаца неабходна рабіць адступленне («чырвоны радок»). Тэкст выроўніваецца па шырыне аркуша, не дапускаецца наяўнасць «вісячых радкоў». Агульны аб'ём асноўнай часткі рэферата – 10–15 друкаваных старонак (без уліку тытульнага ліста, уводзін, заключэння і спіса выкарыстаных крыніц). Унутры рэферата адбываецца нумерацыя старонак. Нумар старонкі прастаўляецца арабскімі лічбамі ў правым ніжнім баку. Тытульны ліст з'яўляецца першай старонкай, аднак лічба на ім не ставіцца. Нумерацыя пачынаецца на першай старонке «Уводзін» з лічбы «2».

4. **Заключэнне** (кароткая частка на адну–дзве старонкі, тут павінны быць сфармуляваны асноўныя вывады, адбываецца абагульненне праведзенай працы).

5. **Спіс выкарыстаных крыніц.** У алфавітным парадку ў адпаведнасці з правіламі бібліяграфічнага апісання падаецца выкарыстаная студэнтам літаратура і іншыя крыніцы (архіўныя крыніцы, матэрыялы перыядычных выданняў, інтэрнэт-сайты, электронныя дакументы і інш.).

6. **Дадатак.** Пры неабходнасці ў гэтую частку рэферата змяшчаюць патрэбны ілюстратыўны матэрыял (малюнкі, карты, схемы, табліцы і інш.). Аднак гэта неабавязковая частка рэферата.

**Прыклад афармлення тытульнага ліста**

**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь**
**Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт**
**Кафедра «Гісторыя, сусветная і айчынная культура»**

**Рэферат**
па гісторыі Беларусі
на тэму **(назва тэмы рэферата)**

**Выканаў:** студэнт групы 112122
будаўнічага факультэта БНТУ
Іваноў Сяргей Пятровіч

**Кіраўнік:** кандыдат гіст. навук,
дацэнт Бяляеў А.В.

**Мінск, 2013**

## Змест

Ад аўтараў…………………………………………………………. 3
Модуль 1. Цывілізацыйная спадчына старажытнага свету, Сярэдніх вякоў і Беларусь (100 тыс. гадоў таму – першая палова XVI ст.)………………………………………………….... 4
Тэма 1. Беларусь у старажытны перыяд……………………… 6
Тэма 2. Беларусь у раннім Сярэднявеччы. Станаўленне дзяржаўнасці ўсходніх славян. Першыя дзяржаўныя ўтварэнні на тэрыторыі Беларусі (VIII–першая палова XIII ст.)…………… 6
Тэма 3. Беларускія землі ў складзе Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага (сярэдзіна XIII–першая палова XVI ст.)………………………………………………… 14
Модуль 2. Цывілізацыйныя працэсы Новага часу і Беларусь (другая палова XVI–пачатак XX ст.)…………………………… 22
Тэма 4. Пачатак Новага часу ў айчыннай гісторыі. Беларускія землі ў складзе Рэчы Паспалітай (другая палова XVI–XVIII ст.)……………………………………………………… 22
Тэма 5. Беларускія землі ў час станаўлення індустрыяльнай цывілізацыі ў складзе Расійскай імперыі ў канцы XVIII–першай палове XIX ст…………………………………….. 30
Тэма 6. Беларускія землі ў перыяд станаўлення і развіцця буржуазнага грамадства ў складзе Расійскай імперыі (другая палова XIX–пачатак XX ст.) (частка 1)…………....... 31
Тэма 7. Беларускія землі ў перыяд сацыяльных узрушэнняў у пачатку XX ст. (частка 1)………………………………… 34
Модуль 3. Беларусь у савецкі перыяд. Станаўленне і развіццё незалежнай Рэспублікі Беларусь (1917–2013 гг.)……………..... 48
Тэма 7. Беларускія землі ў перыяд сацыяльных узрушэнняў у пачатку XX ст. (частка 2)………………………………… 48
Тэма 8. Геапалітычнае становішча Беларусі ў 1921–1939 гг…... 53
Тэма 9. СССР і БССР у другой палове XX–XXI ст. Станаўленне і развіццё суверэннай Рэспублікі Беларусь (1990–2013 гг.)……………………………………………… 58
Правілы напісання і афармлення рэфератаў…………………… 66

Вучэбнае вданне

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

Праграма дысцыпліны
і планы семінарскіх заняткаў
для студэнтаў усіх спецыяльнасцей

Складальнікі:
**БАЖАНАЎ** Уладзімір Аляксандравіч
**БЯЛЯЕЎ** Аляксей Віктаравіч
**ЛЕПЕШ** Аксана Васільеўна
**ЯКУБІНСКАя** Алеся Дзмітрыеўна

Рэдактар *Т. М. Мікулік*
Камп´ютарная вёрстка *А. Г. Занкевіч*

Падпісана ў друк 14.01.2014. Фармат 60×84 $^1/_{16}$. Папера афсетная. Рызаграфія.
Умоўных друк. арк. 3,95. Улік.-выд. арк. 3,09. Тыраж 100. Заказ 1415.

Выдавец і паліграфічнае выкананне: Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт. ЛВ № 02330/0494349 ад 16.03.2009. Пр. Незалежнасці, 65. 220013, г. Мінск.